Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІСТАПАД 4 1933 г. СУБОТА № 244 (4788)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Дэлегатам-ударнікам Усебеларускага злёта якасці— палкае большэвіцкае прывітанне!

СОВЕЦКІ ЛЁН ПАВІНЕН БЫЦЬ ЛЕПШЫМ У СВЕЦЕ

РАЗГОРНЕМ УСЕБЕЛАРУСКАЕ СПАБОРНІЦТВА НА ХУТЧЭЙШУЮ І ЛЕПШУЮ АПРАЦОЎКУ І ЗДАЧУ ІЛЬНУ

Калгасы БССР, адкажыце канкрэтнай справай на ліст работніц фабрыкі „Дзвіна“

БССР з гонарам выканала свае абавязкі перад пролетарыямі Ленінграда

ЦК КП(б)Б—тав. Гікало, ЦВК БССР—тав. Чарвякову, СНК БССР—тав. Галадзеду

Большэвіцкімі намаганнямі рабочых і калгаснікаў, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК, БССР датэрмінова выканала план загатовак бульбы і гародніны для горада Леніна. Працоўныя БССР прынялі на сябе абавязак дадаткова адгрузіць 20.000 тон бульбы.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР правялі і выключную ўвагу да снабжэння рабочых і работніц Ленінграда.

Ленінградскі абласны і гарадскі камітэт УсеКП(б), Ленінградскі аблвыканком і Ленінградскі совет ГОРАЧА ВІТАЮЦЬ ПРАЦОЎНЫХ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ, атрымаўшых буйную перамогу ў выкананні важнейшага дзяржаўнага задання. Мы ўпэўнены, што працоўныя Беларускай ССР і ва ўсіх іншых галінах соцыялістычнага будаўніцтва з большэвіцкай энергіяй змагаюцца за генеральную лінію партыі.

Ленінградскі аблвыканком і Ленінградскі совет выдзяляюць спецыяльны фонд для прэмірання лепшых калгасаў і лепшых ударнікаў БССР. Мы запрашаем рабочых і калгаснікаў БССР прыняць удзел у кастрычніцкіх урачыстасцях у Ленінградзе.

Няхай жыве брацкае супрацоўніцтва народаў Совецкага Саюза!

Няхай жыве БССР!

Няхай жыве слаўная большэвіцкая партыя і яе правадыр т. Сталін!

САКРАТАР ЛЕНІНГРАДСКАГА АБКОМА І ГАРКОМА УсеКП(б) КІРАЎ.

Старшыня Ленінградскага аблвыканкома СТРУППЕ.

Старшыня Ленінградскага совета КАДАЦКІ.

Ударнік—цэнтральная фігура на вытворчасці

(Да ўсебеларускага злёта ўдарнікаў якасці)

Перадавікі — рабочыя прамысловасці БССР сабраліся сёння на ўсебеларускі злёт ударнікаў якасці. На злёт прыбылі ударнікі, якія «УСВЯДОМІЛІ СУТНАСЦЬ СОЦЫЯЛІЗМА ЛЕПШ ЗА ТЫХ, ХТО КІДАЕЦЦА РЭВОЛЮЦЫЙНЫМІ ФРАЗАМІ» (ЛЕНІН), прыбылі тыя, хто жадае працаваць найлепш, заражаючы сілай свайго прыклада астатніх.

Дзе корань таго, што вы сталі ўдарнікамі?

Корань хаваецца ў сутнасці самога прамадскага ладу. Совецкі саюз — адзіная краіна ва ўсім свеце, дзе замест пад няволеной работы на эксплаататара праца стала свабоднай, самай паважнай справай. ТОЛЬКІ ПРЫ ДЫКТАТУРЫ ПРОЛЕТАРЫЯТА ВЫТВОРЧАЯ ПРАЦА «ПРАДАСТАЎЛЯЕ КОЖНАЙ АСОБЕ МАГЧЫМАСЦЬ РАЗВІЦЦЯ ПА УСІХ НАПРАМКАХ І ПРАЯЎЛЯЦЬ УСЕ СВАЕ ЗДОЛЬНАСЦІ, ЯК ФІЗЫЧНЫЯ, ТАК І ДУХОЎНЫЯ» (Энгельс).

У чым сіла ўдарнай работы?

СІЛА ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ТЫМ, ШТО ЎДАРНІКІ ЯК ПЕРАДАВЫЯ І САМЫЯ ДЫСЦЫПЛІНАВАНЫЯ РАБОЧЫЯ СВАІМІ КОМУНІСТЫЧНЫМІ АДНОСІНАМІ ДА ПРАЦЫ ВУЧАЦЬ АСТАТНІХ РАБОЧЫХ І ЎСЮ ПРАЦОЎНУЮ МАСУ, ПАДЦЯГВАЮЦЬ ІХ ДА ЎЗРОЎНЯ ПЕРАДАВЫХ.

Падагуліць вопыт гераічнай барацьбы за гады будаўніцтва соцыялізма, выявіць недахопы ў рабоце, вызначыць канкрэтныя шляхі для іх знішчэння і гэтым самым рухацца наперад яшчэ шпарчэйшымі тэмпамі — такова мэта злёта.

А вопыт багаты і перамог нямала ў нас.

Прасякнуты соцыялістычнай свядомасцю, рабочы клас, пад кіраўніцтвам партыі, ад зруйнаваных фабрык і заводаў, вёсак, праз адбудоўчы перыяд заклаўшы фундамант соцыялістычнай эканомікі і пачаў будаваць бясклясавае грамадства.

Пройдзен вялікі гістарычны шлях за мінімальна кароткі час.

Гэта вынік ударнай працы, творчай ініцыятывы і самадзейнасці рабочага класа і ў першую чаргу ўдарнікаў.

Партыя ўступіла ў другую пяцігодку пабудовы бясклясавага грамадства. Перадовымі стаіць ганарэвая задача. ДАГОНЯЦЬ І ПАФАС НОВАГА БУДАЎНІЦТВА «ПАФАСАМ АСВАЕННЯ НОВЫХ ЗАВОДАЎ, НОВАЙ ТЭХНІКІ» (СТАЛІН).

А што азначае асвоіць новую тэхніку? Асвоіць новую тэхніку значыць авалодаць вытворчасцю, тэхналагічным працэсам, варштатам. Запоўніць прадукцыйнай працай увесь рабочы час, раціянальна скарыстаць і поўнасцю загрузіць абсталяванне. Толькі так мы можам дабіцца сур'ёзнага павышэння прадукцыйнасці працы, сур'ёзнага скарачэння сабекошта прадукцыі і карэннага паляпшэння яе якасці.

Ажыццяўляючы гэтыя ўказанні партыі і яе правадыра тав. СТАЛІНА, рабочы клас прамысловасці Беларусі пад непасрэдным кіраўніцтвам КП(б)Б дабіўся вялікіх перамог у першым годзе другой пяцігодкі. Ёсць рашучыя зрухі у выкананні прамфінплана. Магілёўская гарбарня імя СТАЛІНА выканала план за 10 месяцаў гэтага года на 101 проц., віцебскі фанерны завод — на 100 проц. Чыгуналіцейны машынабудаўнічы завод «КОМУНАР» за 9 месяцаў выканаў сваю вытворчую праграму на 115,3 проц., узняў прадукцыйнасць працы на 119,7 проц., знізіў сабекошт прадукцыі на 11,9 проц. Завод імя ВАРАШ�ылАВА прамфінплан по валавой прадукцыі выканаў на 102 проц., па прадукцыйнасці працы — на 107 проц. Сабекошт знізан на 4 проц. Цэлы рад іншых прадпрыемстваў беларускай прамысловасці свайміперамогамі заваявалі права на ўдзел ва ўсебеларускім злёце.

Гэтыя перамогі ёсць перш за ўсё перамогі перадовых ударнікаў, якія змагаюцца пад сцягам ленінскага спаборніцтва.

Чым як не разгортваннем соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў значнай ступені можна вытлумачыць поспехі віцебскай апаўкі. Апейная гэта — дзвіцчна першай пяцігодкі, мае ўсесаюзнае значэнне. Пушчана яна ў 1931 годзе і разлічана на выпуск прадукцыі 6.000 тон апіфы ў год. Прамфінплан 1931 года складаў усяго 40 проц. да плана 1933 года і быў выкананы на 90 проц. У 1932 годзе прамфінплан выкананы на 61 проц., А Ў 1933 ГОДЗЕ, НА 27 КАСТРЫЧНІКА РАБОЧЫ КАЛЕКТЫЎ ВЫКАНАЎ УВЕСЬ ГАДАВЫ ПЛАН НА 110 ПРОЦ. Маслянісцасць мануфі складае 6 проц. замест 7-мі паводле плана. Завод зараз ідзе на адным з першых месц у Совецкім саюзе. Гэта — вынік разгортвання соцспаборніцтва і ўдарніцтва, пераключэння яго на рэйкі авладання тэхнікай вытворчасці. Гэта-ж факт, што брыгада гэтага завода тав. ДРЫНДРОЖЫНА выконвала сваё заданне на 90 проц., а пасля заключэння соцдагавора з брыгадай КУПЕРА — выкананне прамфінплана дасягае 111 проц.

Лепшыя ўдарнікі завода імя Ланцуцкага КЛІМАЎ, КАРНЕЕЎ, ЗАПОЛЬСКІ («Большэвік») яны самі і іх брыгады сістэматычна перавыконваюць вытворчыя заданні.

Усе нашы поспехі пацвярджаюць нам адно: рэальнасць нашых планаў, іх паспяховае выкананне залежыць выключна ад нас саміх, ад людзей.

Так, шмат ужо зроблена, але наперадзе яшчэ большыя задачы. Наша прамысловасць уступіла ў рашаючы квартал гадавога плана. Многія фабрыкі і заводы, якія з-за дрэннай работы не выконвалі планаў, павінны будуць пакрыць запазычанасць дзяржаве і выконваць вытворчае заданне. Гэта накладае асабліва вялікія абавязкі на кіраўніцтва прадпрыемстваў, на ўсіх рабочых.

Цэнтральнае звяно далейшай нашай работы — гэта якасць. Большэвіцкія тэмпы, памножаныя на якасць — вось што нам зараз патрэбна. Не гледзячы на рашучыя зрухі, усё-ж выкананне якасных паказальнікаў і на сёкешні дзень нас задаволіць не можа. Усебеларускі злёт ударнікаў павінен сюды накіраваць свой агонь.

Асноўнымі прычынамі нездавальняючага становішча якасці прадукцыі з'яўляюцца: дрэнная арганізацыя вытворчасці, нізкая якасць тэхнічнага кіраўніцтва, невыстарчальная работа па павышэнні кваліфікацыі рабочых, нездавальняючая арганізацыя тэхнічнага кантроля і бракеража.

Пераключыць соцспаборніцтва і ўдарніцтва на гэтыя важнейшыя ўчасткі работы—задача ўдзельнікаў злёта. Умець уцягнуць інжынерна-тэхнічных работнікаў у соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, узняць арганізуючую іх ролю ў справе тэхнічнага кіраўніцтва — і поспехі нашы будуць яшчэ большыя. Вось дзяжурны інжынер газагенераторнай станцыі Гомельскага шклобуда тав. ГЖАЗОЎСКІ выклікаў на соцспаборніцтва інжынера ФАМІНА. Пункты дагавора: максімальная прадукцыйнасць генератараў, павышэнне якасці газа, забеспячэнне інструктажа рабочых. Іх прыкладу паследавалі зменныя інжынеры КУЗМІН, КАРНЕЕЎ, КАРПАЧОВА і інш. Усебаковна тэхгадзіна для інструктажа рабочых, што ў значнай ступені ўзнімае прадукцыйнасць працы.

Усебеларускі злёт ударнікаў павінен унесці карэнны пералом у кіраўніцтве соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам, у павышэнне якасці самога спаборніцтва. Яшчэ нярэдкі выпадкі, калі пад рубрыкай ударніка хаваюцца ілжэ-ўдарнікі, якія ганьбяць пачэсную назву сапраўднага ўдарніка. А фабрычна-заводскія арганізацыі слаба яшчэ кідуюць соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам, не ўзнімаюць іх на новую высокаякасную ступень.

Узяць пад пролетарскі абстрэл тых, хто псуе прадукцыю на соцыялістычным прадпрыемстве, акружыць грамадскім ганьбаваннем злосных бракаробаў — задача фабрычна-заводскіх арганізацый.

Але гэта адзін бок работы. Задача заключаецца ў тым, каб побач з разгортваннем вытворча-масавай работы дапамагчы неквалфікаванаму рабочаму авладаць тэхнікай вытворчасці, вывучыць свой варштат. Такіх прыкладаў ужо нямала, калі пад уплывам масавай выхаваўчай работы і пры дапамозе кваліфікаваных рабочых былыя бракаробы перавараюцца ў лепшых ударнікаў. Тут выключна вялікая роля належыць ударнікам.

Узяць пад сваё шэфства тэхнічна малапісьменных рабочых і павесці іх па шляху большэвіцкай барацьбы за высокую якасць работы — пачэсная задача ўдарнікаў усебеларускага злёта. А для гэтага патрэбна ўзброіць у першую чаргу сябе і свайго падшэфнага ведамі тэхнікі.

Наша краіна ідзе на ўсіх парах да таго, каб усе рабіць на совецкіх машынах, з совецкіх матэрыялаў, рукамі совецкіх рабочых і інжынераў, каб поўнасцю авалодаць тэхнічнаю рэканструкцыю ўсіх галін гаспадаркі СССР». (ПОСТЫШАЎ).

Зарукай для ажыццяўлення гэтых задач з'яўляецца ленінскі метад — соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва.

Рабочы клас БССР пад кіраўніцтвам партыі дабіўся рашаючых перамог. Пасляхавае вырашэнне пастаўленых задач партыяй патрабуе ад кожнага рабочага, кожнага працоўнага яшчэ больш напружыць свае сілы на асваенне тэхнікі, на поўнае выкананне колькасных і асабліва якасных паказальнікаў.

Вышэй рэвалюцыйную пільнасць. Жадзны адпор класаваму ворагу і яго агентуры, якія працуюць сарваць наша паспяховае соцыялістычнае будаўніцтва.

Вышэй сцяг ленінскага соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва!

НЕ НІЖЭЙ 13-ГА НУМАРА

(Адозва работніц фабрыкі „Дзвіна“ да калгасаў ільнаводчых раёнаў)

Наша ільнаапрацоўчая фабрыка «Дзвіна» з'яўляецца ініцыятарам усебеларускай вытворчай пераклічкі прадпрыемстваў. Мы ўзялі на сябе абавязак выканаць прамфінплан па ўсіх паказальніках, даць прадукцыю высокай якасці. За час вытворчай пераклічкі наша фабрыка дабілася на аснове разгортвання соцспаборніцтва поўнага выканання прамфінплана.

Мы не толькі выканалі вытворчую праграму, мы дабіліся ўзняцця прадукцыйнасці працы на адно верацяно на 101,4 проц.

У нас ёсць рад ударнікаў, якія паказваюць сапраўдныя ўзоры большэвіцкай працы. Ватэрпічыца БАРАНОЎСКАЯ працуе на фабрыцы з 1905 года; выконвае прамфінплан на 102,4 проц., герой першай пяцігодкі.

Матальнічыца МАРЧАНКА працуе на фабрыцы з 1905 года, выконвае прамфінплан на 110 проц., герой першай пяцігодкі.

А. Галькова працуе на фабрыцы 22 гады, выконвае прамфінплан на 104 проц. Перавыконваюць свае вытворчыя заданні таксама ўдарніцы А. Кавалёўская, А. Ідэль і інш. Гэтыя ўдарніцы—гонар рабочага калектыва.

982 работніцы замацаваліся за фабрыкай да канца другой пяцігодкі.

Трэба падкрэсліць дзелавую сувязь нашай работы з працай на калгасных палях. Якасць прадукцыі, якая дастаўляецца фабрыцы, яшчэ нізкая. Гэта прымушае нас завастрыць увагу перад усімі калгасамі, асабліва ільнаводчых раёнаў, на забеспячэнне «Дзвіны» сыроцом-ільном высокай якасці. Мы патрабуем ад вас—старшынь калгасаў—камандзіраў соцыялістычных палёў—высокаякаснай апрацоўкі ільну—не ніжэй 13 нумара.

Які лён мы атрымлівалі дагэтуль: засмечаны, дрэнна абтрапаны, замест 13 нумара—10-11-ы. Гэта адмоў на адбівалася на нашых якасных паказальніках, на выкананні экспартнай праграмы.

Паляпшэнне якасці прадукцыі, выраб тавараў вышэйшых гатункаў залежыць выключна ад нас саміх, ад нашых адносін да работы, ад нашага ўсвядомлення і жадання мабілізаваць масы на барацьбу за добрую апрацоўку ільну.

Каб забяспечыць лепшую апрацоўку, перш за ўсё неабходны добрасумленныя адносіны да работы. Трэба своечасова разаслаць усю саломку, устанавіць пастаянны кантроль за прыёмкай і апрацоўкай. Уся траста павінна быць своечасова ўбрана з поля, нельга ні ў якім разе дапусціць накідання яе пад снегам. Толькі своечасовае парнічае трасты забяспечвае моцнасць, маслянісцасць і чыстату валакна. Вялікае значэнне мае сушка трасты. Ні адзін кілаграм ільну не павінен паступаць на ільназаводы з вільготнасцю вышэй нормы.

Пры сялянскай апрацоўцы ільну трэба перад пускам трасты ў мялкі адсартаваць яе па таўшчыні і даўжыні.

Рашаючую ролю адыгрывае трапанне ільну. Без беражлівых, уважлівых адносін да апрацоўкі нельга атрымаць добры, раўнамерна атропаны лён.

Былі выпадкі, калі ў ільне, які паступаў на фабрыку, знаходзілі такія рочы як жалезка, каменні, лясок і інш. Тут мы маем яўнае праяўленне шкодніцкай дзейнасці класавага ворага, накіраванай на псаванне ма-ны, зрыў нашых планаў. Гэта патрабуе ад нас максімальнай класавай пільнасці, мабілізацыі ўсіх сіл для барацьбы з манеўрамі кулацкіх элементаў. Неабходна арганізаваць пільны кантроль над усімі ўчасткамі работы, стварыць пастаянныя бракеражныя камісіі, якія будуць сачыць за ўсімі працэсамі апрацоўкі ільну.

Для таго каб забяспечыць бесперабойную работу фабрыкі, каб поўнасцю выканаць экспартную праграму, неабходна дабіцца поўнай і своечасовай здачы ільнавалакна, у тэрміны, вызначаныя партыяй і ўрадам. Гэта баявая задача кожнага калгаса і калгасніка. Мы ўжо зараз адчуваем недахоп сыроца, што стварае пагрозу пераканання вытворчай праграмы. Таму мы патрабуем ад вас, таварышы, ні ў якім разе не зацягваць здачы ільну, па-ўдарнаму да тэрміну выканаць планы ільназагатовак.

Мы ў сваю чаргу абавязуемся поўнасцю выканаць прамфінплан IV квартала па ўсіх паказальніках, яшчэ больш разгарнуць соцспаборніцтва сярод рабочых і работніц.

За дружную, ініцыятыўную большэвіцкую работу!

(Адозва прынята на ўсіх цэхавых сходах і падпісана 2.025 работніцамі фабрыкі).

Ход бульбапаставак на 1 лістапада

Назва раёнаў	Проц. выканання	Назва раёнаў	Проц. выканання
1. Барысаўскі	100,0	39. Бярэзінскі	79,2
2. Чэрыкаўскі	100,0	40. Хойніцкі	78,8
3. Дрысенскі	100,0	41. Старобінскі	78,2
4. Бягомльскі	99,4	42. Ельскі	78,2
5. Крычаўскі	99,3	43. Лельчыцкі	77,6
6. Камарынскі	99,2	44. Парыцкі	77,3
7. Гарадокскі	98,8	45. Бабруйскі	76,9
8. Брагінскі	94,5	46. Лёзненскі	76,7
9. Любанскі	93,4	47. Чашніцкі	76,1
10. Капыльскі	91,4	48. Веткаўскі	75,8
11. Асвейскі	91,2	49. Чачэрскі	75,7
12. Чавускі	89,5	50. Клічаўскі	75,1
13. Смалявіцкі	89,2	51. Сіроцінскі	75,0
14. Асіпавіцкі	88,5	52. Сенненскі	74,8
15. Уздзенскі	88,2	53. Лагойскі	74,4
16. Ушацкі	88,1	54. Кармянскі	73,7
17. Аршанскі	86,9	55. Дзяржынскі	73,3
18. Чырвона-Слабодскі	86,5	56. Крупскі	73,1
19. Пухавіцкі	86,1	57. Дубровенскі	73,0
20. Слуцкі	85,8	58. Церахаўскі	71,5
21. Нараўлянскі	85,8	59. Гомельскі	70,0
22. Менскі	85,5	60. Мсціслаўскі	69,8
23. Касцюковіцкі	84,5	61. Быхаўскі	69,4
24. Віцебскі	84,2	62. Петрыкоўскі	68,8
25. Бельзніцкі	83,8	63. Б.-Капалеўскі	68,3
26. Тураўскі	83,8	64. Глускі	65,1
27. Жыткавіцкі	83,8	65. Заслаўскі	64,3
28. Суражскі	83,6	66. Узбраўіцкі	62,3
29. Маслеўскі	82,7	67. Прапойскі	62,3
30. Чэрвенскі	82,5	68. Горацкі	62,2
31. Шклоўскі	82,4	69. Бешанковіцкі	61,1
32. Расонскі	81,7	70. Плешчаніцкі	61,0
33. Маёрскі	81,6	71. Рэчыцкі	56,3
34. Жлобінскі	81,5	72. Клімавіцкі	55,5
35. Рагачоўскі	81,3	73. Талачынскі	51,2
36. Полацкі	81,0	74. Лоеўскі	47,6
37. Лепельскі	80,0	75. Чырвонапольскі	37,4
38. От.-Дарожскі	79,9	РАЗАМ ПА БССР	77,8

У Крупках кантрактацыйны дагавор ператварылі ў кавалак паперы

Крупскі раён з'яўляецца адным з самых адсталых як па загатоўках ільнасеяння, так і валакну. Да 1-га лістапада раён выканаў план на насенню на 56,1 проц. (сярэдні па ільнаводчых раёнах 79,9); па валакну на 3,3 (сярэдні 11,8).

У раёне няма ніякіх даных аб тым, як выконваюцца кантрактацыйныя дагавары. Ні адзін сабатажнік загатовак да адказнасці не прыцягнут. **У большасці сельсоветаў дагаворы фактычна з'яўляюцца простым, ніколі не абавязваючы, кавалкам паперы.**

Сталінская ільнаэстафета не выпла за межы габінетаў: ніхто не займаўся яе арганізацыяй. Ва Ўзнацкім, Ігрунацкім і Крупскім сельсоветах калгаснікі і аднаасобнікі і нічога не ведаюць пра эстафету.

У калгасе «Новы шлях», Узнацкага сельсовета, не абмалочаны галоўкі ільну на плошчы ў 110 га. Здана замест 84 цнт. насення, толькі 13. У калгасе імя Варашылава старшыня Кулік зчаў у галоўках 8,5 цнтн. насення.

У калгасе «Чырвоны колас», Траяноўскага сельсовета, на 40 проц. скошана траста на плошчы ў 17 га.

Лекалькі слоў аб ільназаводах. Аб чуткі ільназавод не ўкамплектаваны кадрамі. Толькі ў канцы кастрычніка ён трыступіў да работы. Да гэтага часу траста не прымалася. Ухвалькі ільназавод да канца кастрычніка не меў ні сярэмчнага, ні адміністрацыйнага апарата і не прымаў прадукцыі. Поўную адказнасць за гэта плос ільнатрактарацэнтр, які не цікавіцца работай заводаў. **А. П.**

Усебеларускі конкурс на датэрміновае выкананне плана ільназагатовак

З 1-га лістапада па 15 снежня праводзіцца ўсебеларускі конкурс на датэрміновае выкананне плана загатовак ільну і канапель па колькасці і якасці, на разгортванне масавай работы, лепшае абслугоўванне здатчыкаў і ўзорную арганізацыю загатовак.

У конкурсе прымаюць удзел усе сельсоветы, калгасы, калгасныя брыгады, МТС, ільназаводы, загатпункты, райаддзяленні Загатлён, райзагі, раённыя і палітаддзельскія газеты, ударнікі калгасаў і інш.

Для прэміявання лепшых удзельнікаў конкурса вызначана 50 тыс. руб.

Для сельсоветаў устаноўлены тры прэміі на суму ў 1.100 руб., для калгасаў — 16 прэмій на 4.200 руб., для старшынь сельсоветаў — 18 прэмій на 4.700 руб., для старшынь калгасаў і іх намеснікаў — 30 прэмій на 5.000 руб., для брыгадзіраў калгасаў — 45 прэмій на 6.300 руб., для ўдарнікаў - калгаснікаў — 100 прэмій на 8.400 руб., для прыёмшчыкаў загатпункту і каперацыі — 25 прэмій на 4.300 руб. і г. д. Усяго вызначана 280 прэмій.

Для кіраўніцтва конкурсам створан усебеларускі штаб з 9 чал. пад старшынствам нам. упаўнаважанага Кемзаг СНК т. Кэўфмана. На месцах ствараюцца раённыя конкурсныя камісіі.

ГЕРМАНІЯ УЗБРОИВАЕ НАНКІН

ПАРЫЖ.

«Юманітэ» публікуе даныя аб ваенных заказах нанкінскага ўрада Германіі. Газета піша:

«Германская кліка кінула 400-тысячную армію супроць кітайскіх Совецкаў у правінцыях Цзян-сі і Фук'ен.

Гэта армія знаходзіцца пад камандаваннем германскіх афіцэраў. Яна ўзброена і фінансавана імперыялістычнымі дзяржавамі.

Апошнія факты даказваюць, што германскі фашызм развівае ў Кітаі шалёную актыўнасць. Германія экспартуе ў Кітай велізарную колькасць зброі, танкаў, аэраплянаў і амуніцыі. Нядаўна ў Шанхаі быў выгружан вялікі транспарт зброі для генерала Лю-Сіана, які стаіць на чале барацьбы супроць совецкіх правінцый Кітая.

Нанкінскі ўрад порадаў Германіі буйныя авіяцыйныя заказы. Шанхайская прэса паведамляе, што германскія капіталісты прыступілі да пабудовы ў Кітаі ваенна-амуніцыйных заводаў».

ПАДРЫХТОЎКА РАСПРАВЫ НАД РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ФРАКЦЫЯЙ ЛАТВІЙСКАГА СОЙМА

РЫГА, 2. (БЕЛТА).

Хоць пытанне аб выдачы суду ўсёй рабоча-сялянскай фракцыі сойма камчаткова яшчэ не вырашана і лёс яе высветліцца толькі на бліжэйшым пленарным пасяджэнні сойма, орган латвійскіх фашыстаў «Латвіс» патрабуе неадкладнага арышту ўсіх членаў рабоча-сялянскай фракцыі, а таксама ліквідацыі с.-д. фракцыі сойма.

ВЫСТУПЛЕННІ Ў ЧЭШСКІМ СЕНАЦЕ ЗА ПРЫЗНАННЕ СССР

ПРАГА (БЕЛТА).

Міністр замежных спраў Бенеш выступіў у сенаце з дакладам аб знешня-палітычным становішчы, у якім між іншым сказаў: «у створанай абстаноўцы СССР правіў сапраўдзтае разуменню неабходнасці ўмацавання міра, што выявілася ў заключэнні пактаў аб ненападзе з суседнімі краінамі».

У спрэчках па дакладу многія сенатары, прадстаўнікі розных партый выказаліся за нармалізацыю адносін Чэхаславакіі з Саюзам ССР.

ЭСТОНІЯ ЗАЦВЕРДЗІЛА ЛОНДАНСКУЮ КАНВЕНЦЫЮ

ТАЛЛІН (Рэвель) (Белта).

Эстонскі сойм камчаткова зацвердзіў лонданскую канвенцыю аб азначэнні нападаючага боку.

КРУШЭННЕ ЯПОНСКАГА ВАЕННАГА ЭШАЛОНА

ТОКІО, 2. (Б�ЕЛТА).

Як паведамляе Сімбунрэнго з Гірына, на станцыі Янгуншань (Гірын-хайлунскай чыгунцы) першага лістапада адбылася сутычка вайсковага эшалона з таварным цягнікам. У рэзультаце ўзарваліся болцярнасы эшалона. Загінула 12 японскіх салдат і каля 20 манчжурскіх салдат.

ЗАРУБЕЖНЫЯ ПРОЛЕТАРЫІ РЫХТУЮЦЦА ДА КАСТРЫЧНІЦКАЙ ГАДАВІНЫ

СТАКГОЛЬМ. (БЕЛТА).

Шведская і дацкая рабочыя делегацыі выязджаюць з Стакгольма 3-га лістапада ў СССР на кастрычніцкія ўрачыстасці. Большасць делегатаў — члены соцыял-дэмакратычнай партыі і беспартыйныя рабочыя.

ВЕНА. (БЕЛТА).

Згодна паведамленню з Сафіі, у сувязі з набліжэннем XVI гадавіны Кастрычніка, арганізацыі рабоча-сялянскага блока разгарнулі на ўсёй Балгарыі шырокую кампанію ў абарону СССР.

У гэтай кампаніі поспехі СССР процідастаўляюцца развалу ў капіталістычным свеце і асабліва падкрэсліваецца цяжкае становішча працоўных мас Балгарыі.

Паводле афіцыяльных, значна перапаўненых даных, у Балгарыі зараз звыш 250 тыс. беспрацоўных і сярод іх больш паловы ўсяго ліку рабочых. Ідуць новыя масавыя звальненні рабочых буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў.

Краіна Совецкаў перад 16 Кастрычнікам

УРАЧЫСТЫ ПУСК ДРУГОЙ ЧАРГІ ГПЗ

Учора ва ўрачыстай абстаноўцы пролетарыі першага ГПЗ імя тав. Кагановіча адкрывалі другую чаргу завода. Урачыстасць пачалася зранку. Каля 15 тыс. рабочых па працягу дня знаёмілі сваіх жон і дзяцей з новымі цэхамі гіганта. У поўдзень у цэхах былі арганізаваны гульні, танцы, масавыя забавы, якія цягнуліся да вечара.

Цэхі прынялі святочны выгляд. Кветкі, макеты, лозунгі, чырвоныя сцягі, партэты правадыроў упрыгожылі цэхі і агрэгаты. У 4 гадзіны дня для ўдарнікаў была паладжана таварыская вячэра.

Увечары ў шырокім праляёце пакрыцця цэха роліка́ў, у прысутнасці 7 тысяч ударнікаў завода і прадстаўнікоў маскоўскіх арганізацый і прадпрыемстваў, адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае пуску другой чаргі. З рапартам аб выніках будаўніцтва другой чаргі і аб асваенні тэхнікі вытворчасці выступіў начальнік будаўніцтва і дырэктар завода Бадроў.

15-тысячны калектыў завода да пуску другой чаргі прыйшоў з велізарнымі перамогамі. Трактарная прамысловасць краіны цалкам працуе на совецкіх машынах.

Тав. Бадроў прыводзіць кароткія лічбы велізарных капіталажкладанняў на будаўніцтва і абсталяванне гіганта. Кошт устаноўленых варштатаў—90 млн. руб. 5 млн. выпушчаных пад пяцігодку з'экономілі кранае 10,5 млн. руб. зоатам. Завод ставіць сваёй ближэйшай задачай вызваліць аўтамабільную прамысловасць ад імпарта падшыпнікаў.

У канцы ўрачыстага пасяджэння выступілі з ярыцкіяльнымі прамовамі т. т. Орджанікідзе і Кагановіч, спатканыя авацыямі.

Урачысты сход паслаў прывітанне т. Сталіну. Пасля сходу т. т. Орджанікідзе і Кагановіч у суправаджэнні дырэктара завода, сакратара парткома і лепшых ударнікаў агледзелі новыя цэхі другой чаргі.

Дастойная сустрэча вялікай гадавіны

МАСКВА, 2. (БЕЛТА).

Вытворчымі перамогамі, барацьбой за культурны быт сустракаюць рабочыя і калгаснікі РСФСР Кастрычніцкую гадавіну.

У Маскоўскай вобласці пры кожным калгасе МТС, заходна раённая плянума МК і МГК УсеКП(б), арганізуюцца ўзорныя хаты-чытальні (народныя дамы). Звыш 30 народных дамоў працуюць ужо. Дамы абсталёўваюцца магутнымі радыё-ўстаноўкамі і кіно, забяспечваюцца стацыянарнымі біблятэкамі, патэфонамі, музычнымі інструментамі, спартыўным інвентарам.

Рабочыя завода «Электросила» (Ленінград), завода «Красный гидропресс» (Таганрог) і завода імя Андрэева (Таганрог) пасцяхова выканалі кастрычніцкую праграму.

Ударнікі дэпо Барнаул (Заходняя Сібір) адрапартавалі звыш плана 2 паравозы.

Буйнымі перамогамі сустракаюць гадавіну далёкія акраіны Саюза. Расце Далёка-ўсходні край. Шырака развіваецца рыбная прамысловасць — асноўная галіна гаспадаркі края. Будуцца першы цукровы і цементны заводы.

Працуюць лесапільныя заводы, якія даюць прадукцыю вышэйшай якасці. У лесавой тайзе будуецца новы прамысловы цэнтр—горад Комсамольск.

Асноўны капітан лёгкай прамысловасці за апошнія пяць год павялічыўся больш чым у два разы. Прадукцыя прамысловасці за гэты час вырасла на 375 проц., прычым прадукцыя цяжкай прамысловасці вырасла больш чым у 5 раз.

Арганізавана 250 МТС. У Якуціі арганізуецца 3 новыя машынатрактарныя станцыі ў збожжавых раёнах. У самым Якуцку адкрываецца больніца і здаюцца ў эксплаатацыю 3 дамы для спецыялістаў.

СУСВЕТНЫ РЭКОРД МАГНІТАГОРЦАЎ

МАГНІТАГОРСК, 2. (БЕЛТА).

Доменныя печы № 3 паставілі сусветны рэкорд па прадукцыйнасці, выканаўшы месячную праграму на 125 проц. Мартэнаўская печ № 3 выканала праграму па кастрычніку на 162 проц. Рабочыя печы ў найкарацейшы тэрмін асвоілі яе праектную магутнасць, не дапусцілі ні адной аварыі. Коксавыя ўпершыню на 4-х батарэях дабіліся 105 проц. месячнага плана. Блюмінг месячны план выканаў на 106,2 проц. Ён пракатаў 8.330 тон сталі.

БАГАЦЦІ СОВЕЦКАЙ ЗЯМЛІ

ЛЕНІНГРАД, 2 (БЕЛТА).

Геалагічная партыя Цэнтральнага нафтавога-даследчага разведачнага інстытута сёмрыла на р. Тэкелі ў цэнтральнай частцы Алатаў (Казакстан) сціброва-медна-срэбранае месцазарадкжэнні і на р. Кары месцазарадкжэнне рассыпнога золата.

***

ТАШКЕНТ, 2 (БЕЛТА).

Разведачная партыя «Алтайзолата» ўстанавіла ў 28 раёнах Іссык-Кульскага басейна Кіргіі 9 залатаносных плошчаў. У некаторых пунктах, на думцы начальніка партыі, ужо цяпер магчымы стаўцельскія работы

ЧЫСТКА ПАРТЫІ

ВЫКРЫВАЮЧЫ І ВЫКАРАНЯЮЧЫ ПАДРЫЎНУЮ РАБОТУ БУРЖУАЗНЫХ ПЕРАРАДЖЭНЦАЎ І ДВУРУШНІКАЎ, ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ НА ПАСПЯХОВАЕ ЗАВЯРШЭННЕ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАГА ГОДА

Чаму сарваўся сход

Першы сход па чыстцы ячэйкі горацкага РВК сарваўся. Прычыны зрыва — адсутнасць усякага абмеркавання.

Гэты сход партячэйка меркавала, як відаць, правесці «цішком» без мас, не выносячы «смецця з рабочакамоўскай хаты». Для гэтага імпат прычын. Возьмем па перажку. Больш года на чале РВК стаіць Кандраль—сын кулака, жадаўна асуджаны Вярхоўным судом на два гады пазбаўлення волі за давядзенне сустрэчных планаў па пастаўцы. Кандраль падабраў належны «штапік». Старшынёй рай КСУ быў прызначаны Клецко—выключаны з партыі за шкодніцтва; у апарадзе былі Атрашонак—кулак, выкінуты з партыі, Капусцін—кулак, Лабусаў—выключаны з партыі за сувязь з кулакамі. Уся гэта кулацкая «сітуейка» тварыла на вачах у райпартарганізацыі сваю кулацкую справу.

І няма нічога дзіўнага, калі прысутнічаючыя ўчасткі ў калгаснікаў далёка перавышаюць скае нормы, што ў некаторых сельсоветах (Шапырскі) захват калгаснай зямлі дасягае 30 га, а ўсяго па раёну адабрана з калгаснага масіва 2,5 тысячы га.

Сакратарыты ў калгасах раёна арганізаваны так, што жыта прыходзіцца сарваць есць на іншу.

Блытаніны з зямельнай плошчай у раёне кошмі хочаш. Штодня ў РК КП(б)В сельсоветы адзін за другім скардзяцца на адсутнасць паказанай штанам зямлі. Нікалаўскі сельсавет амаль поўнасцю скончыў пастаўкі абежка дзяржаве, а план па яго сельсавету лічыцца далёка незакананым: за ім лічыцца значна больш зямлі, чым фактычна ёсць.

Кулацкая практыка ў Горацкім раёне праводзілася зусім адкрыта. Так, па Ільнозагатоўках кантрактацыйных дагаворы даводзіліся так, каб больш пяцідзесяці гектараў, а меншы—кулацкія гаспадарні; калгасы абавязаны, згодна дагавора, здаць дзяржаве 1,2 цэнт. льнагалавакна з га, працоўныя алнасяснікі—1 цэнт., а кулацка-заможныя гаспадарні—0,89 цэнт. Такім-жа чынам праведзена і нумерацыя якасці ільну.

Такая-ж палітыка праводзілася і ў выпуску леса. Так, калгасны сектар, згодна райкага плана, павінен быў вывезці 25 кбм. на аднаго каня за год, працоўны алнасяснік 18 кбм., а кулацка-заможныя гаспадаркі—толькі 12 кбм.

І зусім зразумела, чаму ў Горацкім раёне не па-большэвіцку (мякка кажучы) сустрэлі камісію па чыстцы, чаму «РК КП(б)Б не змог поўнасцю ўключыцца ў чыстку, забяспечыць усямерную дапамогу і падтрымане раённай камісіі па чыстцы, увязаць пытанні чысткі з правядзеннем асноўных сельска-гаспадарчых работ» (з пастановы ЦК КП(б)Б аб становішчы кіраўніцтва горацкай партарганізацыі).

Кандраль асуджаны, але кулацкае аховоце ў РВК засталося і робіць сваю справу. Сакратар РВК Лабусаў пасля ўжо асуджэння Кандраля запрасіцца ў габінеце і перапраўляе старыя пратаколы прэзідыума аб давядзенні сустрэчных планаў. Задним числом піша новыя пастановы і ўключае непрысутнічаўшых на пасяджэнні асоб, якія нічога аб гэтым не ведаюць.

Старое кіраўніцтва знята. Здавалася-б, што райпартактыў павінен быў мабілізаваць усе свае сілы на дапамогу новаму кіраўніцтву, каб дабіцца неадкладнага пералома ў рабоце раёна. На справе-ж гэтага не было. Гаворачы на афіцыяльных пасяджэннях аб неабходнасці дапамогі новаму кіраўніцтву, рад работнікаў двурушнічалі. На справе яны не згодны былі з пастановай ЦК.

У гэтым святле незвычайнай з'яўляецца заява нам. старшыні РВК т. Тваровскага:

— Паглядзім, як новае кіраўніцтва будзе працаваць.

Да рэчы, аб т. Тваровскім. На працягу двух год работы ў раёне гэты комуніст не бачыў ані дзіднасцяй, якія рабіліся. Сямейнасць, п'яныя оргіі, самазабеспячэнне (у часе работы загатчыкам арт-аддела ў РК КП(б)В прахадзімца-кулака Белавусава) не праходзілі без яго ўдзела. З'яўляючыся першым намеснікам старшыні РВК па планаванні, ён зусім натуральна не мог быць у баку ад усіх скажэнняў партыйнай лініі ў раёне. Іменна ён у першую чаргу павінен несці адказнасць за тую блытаніну ў планаванні, якая там зараз ёсць. Іменна на ім ляжыць адказнасць (разам з загатчыкам раёна Апейнікавым) за тое, што ў раёна да гэтага часу няма плана другой пяцігодкі.

Кандраль зусім правільна асуджан за давядзенне сустрэчных планаў, а ён, Тваровскі — кіраўнік планавання, сакратар парт'ячэйкі застаўся ў баку ад усяго гэтага. Трэба выкрыць сапраўдны твар гэтага двурушніка перад усёй партыйнай арганізацыяй раёна.

Партыя арганізавала палітаддзелы. Яны закліканы адыграць выключна важную ролю ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, у ператварэнні калгасаў у сапраўды большэвіцкія, а калгаснікаў у заможных. Партарганізацыя Горацкага раёна абавязана стварыць для работы палітаддзела МТС належныя ўмовы, дапамагаючы яму ў выкананні ускладзеных на яго задач. Але ў Горках аб гэтым думаюць інакш. Калі ў часе работы Кандраля кулак абараняўся ад «нападкаў» палітаддзела ў габінеце сакратара РВК, дык зараз, пасля пастановы ЦК КП(б)Б, кулакае аховоце апусцілася непасрэдна ў калгас.

Ні чым іншым, як агідным выступленнем супроць палітаддзела з мэтай прыкрыцця кулацкіх элементаў, трэба лічыць абарону т. Алейнікавым групы кулакоў калгаса «Чырвоны Асеўлік», Рэкшанскага сельсавета, якія імкнуліся згнаіць сабранае сена. Загатчык раёна т. Алейнікаў, паперакор рас параджэнню начальніка палітаддзела т. Серафімава ад прыцішэнні да адказнасці вінаватых у гэтым, склаў камісію, паслаў яе непасрэдна ў калгас і «змайстраваў» акт, паволле якога выходзіць, што вінаватыя ў псаванні сена не кулакі, а палітаддзел. Па сутнасці Алейнікаў уначаліў работу кулакоў для падрыва аўтарытэта палітаддзела.

Фактаў ігнаравання палітаддзела, стварэння перашкод яго рабоце можна прывесці значна больш, але і гэтага да волі, каб даць зусім правільную, большэвіцкую ацэнку гэтым з'явішчам.

І вось сход, прысвечаны чысткі ячэйкі РВК, у склад якой уваходзіць асноўная група кіруючых савецкіх работнікаў раёна, зрываецца з-за непадрыхтаванасці. Нават звычайных аб'яў аб месцы і парадку чысткі не вывесілі. Прыкрываючыся запрасцай на выкананні гаспадарча-палітычных кампаній, ячэйка сарвала падрыхтоўку да чысткі, даб утаіць перад камісіяй на чысткі грубейшыя скажэнні генеральнай лініі партыі ў раёне, буйнейшыя палітычныя прарывы ў рабоце РВК.

ЯЎХ. ГОЛЬДШВАРЦ.

БАРЫСАЎСКІ РАЙПРАФСОВЕТ ХВАРЭЕ МАСАБАЯЗНЮ

Злішнёе органаў Наркампрацы з прафсаюзамі, перадача ў іх непасрэднае ведамне функцый санстраха, аховы працы і працоўнага заканадаўства з'яўляецца фактарам найвялікшай важнасці ў справе далейшага паляпшэння матэрыяльна-бытавога абслугоўвання рабочых і павышэння прадукцыйнасці працы. Гэта мерапрыемства ў сістэме ўсёй перабудовы работы прафорганаў у адпаведнасці з новай абстаноўкай і заданнямі яшчэ больш павышае ролю прафсаюзаў у барацьбе за выкананне задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Асноўнае ў перабудове работы прафорганаў — паварот іх тварам да вытворчасці, сапраўднае ўзначаленне твор чай актыўнасці мас, чулыя і ўважлівыя адносіны да іх запатрабаванняў.

Падыходзячы з гэтага пункта погляда да ацэнкі ступені перабудовы работы прафсаюзнай арганізацыі Барысаўшчыны, трэба сказаць, што сапраўдная перабудова, перабудова па сутнасці няма яшчэ на многіх прадпрыемствах. Стракатасць і аднаві ў выкананні прамфінплана самі сабой паказваюць работу прафорганаў на прадпрыемствах. Справа ў тым, што работа прамысловасці ў Барысаве характарызуецца значным зніжэннем выканання прамфінплана за трэці квартал у параўнанні з першым паўгоддзем на большасці прадпрыемстваў. Напрыклад, па гуце імя Домбаля выкананне прамфінплана з 100 проц. у першым паўгоддзі знізілася да 90 проц. у трэцім квартале; аднаведна па лесазаводу імя Молатава з 86,6 проц. да 85 проц., па мэблевазму цэху камбіната «Камінтэрн» са 100,3 проц. да 69,7 проц. Многія прадпрыемствы (фабрыка імя Леніна, завод імя Молатава, «Чырвоны металіст» і «Пролетарская перамога») не толькі не забяспечылі павышэння выканання прамфінплана ў кастрычніку, а далі нават яшчэ большы процант зніжэння. Бяздзейнасць кіруючых арганізацый тэтых прадпрыемстваў, натуральне расхлябанасці відавочна. Характэрна, што пры такім становішчы ні адзін з фабзаўкомаў гэтых прадпрыемстваў не хоча проста і адкрыта прызнаць сваю бяздзейнасць, а імкнецца тым ці іншым мэнэўрам схавацца за «аб'ектыўнічыну», наўва думаючы, што калі ў цэхах ёсць цэхкомы, а ў брыгадах прафарганізатары, калі выпучаны страх делегаты і грамадскія інспектары, дык нездалежна ад таго, як яны працуюць, ужо ўсё дадна для выканання вытворчых задач. Так разумець перабудову прафсаюзнай работы — значыць разумець яе па форме, а не па сутнасці справы, ці, вярней, нічога не разумець.

Паспяхова змагацца за прамфінплан можна толькі тады, калі вузлавыя пытанні вытворчасці, пытанні матэрыяльна-бытавых умоў і культурнага абслугоўвання рабочых займаюць штодзённую, неаслабную ўвагу прафорганаў і знаходзяць сваё практычнае вырашэнне, калі кіраўніцтва работай носіць аперацыйны характар. Возьмем такое важнейшае пытанне работы прафсаюзаў, як разгортванне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Кіраўніцтва ўдарным рухам, нават на перадавых па выкананні прамфінплана буйнейшых прадпрыемствах, пастаўлена далёка неадэкватна. На гуце імя Домбаля з 760 рабочых лічыцца ўдарнікамі 168 чал. Апошняя працэдура ўдарнічэтва на гэтым прадпрыемстве праводзілася [illegible] месяцы тому назад. І нічога дзіўнага, калі пры такой сістэме правяркі лічыцца ўдарнікам [illegible] якія працуюць дрэнна.

Напрыклад, работніцы абрэзачнага цэха фальтаў і Глямбскага выпускаюць прадукцыю дрэннай якасці. 20 проц. прадукцыі першага гатунка, якая праходзіць праз іх рукі абрэзку, робіцца непрыгоднай для экспарта і таму перапраўляецца ў другасную для мясцовага рынка. Рабочыя шліфоўні Апяксеў і Дзеляўскі таксама ў пагоні за кольскасцю даюць дрэнную, непрыгодную для экспарта якасць. Аднак, гэтыя работніцы лічыцца ўдарнікамі, бо брак па вырабу экспартнай прадукцыі не зялічваюць у брак.

На фабрыцы «Пролетарская перамога» з 2.420 чал. — 764 ударнікі. Праверка ўдарніцтва па цехавых сходах праводзіцца там штомесячна. У працэсе работы выяўляюцца выпадкі парушэння працоўнай дысцыпліны і нідбайнасці, але на гэтых фактах прафсаюзныя арганізацыі не заўсёды рэагуюць. У этыкеравачна-каробачным цэху работніца Бурсова мае ўдарную кнігу, а насценная газета яна размалёўвае, як ударніцца па сістэматычнае спазненне на працу. Між тым, на гэтую заметку цэхком не рэагавалі, пытанне аб яе ўдарнічэнне не абмяркоўваецца да тэрміна асуднага перагляду склада ўдарнікаў. Аб фармальным падыходзе да вызначэння ўдарнікаў сведчаць яшчэ і больш курёзныя факты. У пенальным цэху лесазавода імя Молатава, дзякуючы праведзеным рацыяналізатарскім мерапрыемствам, прадукцыйнасць працы павысілася на 78 проц. Рацыяналізацыя ўведзена ўжо даўно, а нормы выпрацоўкі застаюцца да сёнешняга дня старыя. Пры гэтых нормах палкроўшчыкі выконваюць вытворчае задание на 182—210 проц. Заўком пацвяшаецца такімі паказальнікамі, зусім забыўшы аб тым, што нормы выпрацоўкі іх няправільныя.

Як агульнае з'яўішча на прадпрыемствах, за выключэннем асобных цэхаў камбіната «Камінтэрн» не праяўляецца выкананне ўзятых абавязкаў брыгадамі па соцпаборніцтву. Пры адсутнасці належнага кіраўніцтва ходам соцпаборніцтва ў пізавых вытворчых звеннях многія гаспадарча-разрахунковыя брыгады (імя Домбаля, «Пролетарская перамога», фанерны завод) ісюуюць фармальна, няма патрэбнай эфектыўнасці гаспадарчага разрахунку.

Некаторыя фабзаўкомы не толькі своечасова не мабілізуюць увагу рабочых мас на знішчэнне наяўных вытворчых непаладкаў, а дэзарыентуюць работных сваім антымізмам, асноўтаючыся толькі на лічбовых паказальніках выканання прамфінплана. Асобна па гэтаму пытанню необходна спыніцца на рабоце фабкома бярэзінскага камбіната. Зайдзіце ў любы цэх запалкавай фабрыкі, пагаварыце з любым рабочым ці работніцай, яны з гонарам заяўляюць: «На выкананню прамфінплана на нашай фабрыцы ідзе ўпераздаг сярод барысаўскіх прадпрыемстваў. Па лічбах так. «Пролетарская перамога» кастрычніцкі план выканала на 104,3 проц. Калі-ж уводзіцеся ў глыбіню пытання, дык атрымліваецца малюнак далёка не такі, як яго прадстаўляе кіраўніцтва фабрыкі. План для экспарта, аказваецца, выканан толькі на 71 проц. З экспартнага выробу цэх запалак ідзе ў брак, які выкарыстоўваецца для мясцовага рынка. У выдзіленні выканання плана існуе самашукальства. На фабрыцы з 15 верасня па 1 лістапада — адпусканы перыяд. У адпаведнасці з уходам у адпачынак адной трэці рабочых запалкавы трэст устанавіў за гэты час выпуск 2.520 ящыкаў штодзённага выраба запалак — 1.600 ящыкаў. Дзве трэці рабочых адбылі свой адпачынак з 15 верасня па 15 кастрычніка. Астатняя частка рабочых, якая пакінена адпачываць з 15 кастрычніка, адпачынкам не карысталася, значыць фабрыка на працягу другой паловы кастрычніка працавала пры поўным складзе рабочых з поўнай нагрузкай абсталявання. Аднак, выкананне прамфінплана кіраўніцтва фабрыкі вылічае па зменшанай праграме, разлічанай толькі на дзве трэці склада рабочых і самадзяльна казырае лічбай 104,3 проц. Па форме гэта правільна, — такое задание трэста, а па сутнасці самае нахабнае «очковтирательство».

Стэрнынія фабкома так. Фрэйндорф лічыт не ведала гэтай «механікі» вылічэння і запэўнівала нас, што вылічэнні выканання прамфінплана ў другой палове кастрычніка праводзіцца з раз ліку 2.520 ящыкаў. Наўстае пытанне, як можна кіраваць масамі, мабілізоўваць іх на барацьбу за прамфінплан, не ведаючы хода яго выканання?

На працягу ўсяго кастрычніка не было таго дня, каб у цэхах не было выпадка спынення работы з прычыны розных тэхнічных непаладкаў. Этыкеравачна-каробачны цэх аходзіцца на затрымкі ў змазальным цэху, змазальны—на аўтаматы, аўтаматы—на гэтыя цэхі, пашосвіт аднаго другому «рагожнымі сцягі», склікаюць сходы, а затрымкі па-ранейшаму працягваюцца. І аказваецца, усё з-за такой дробязі, як недахоп касета (шпінык, на які накладваюцца каробкі). Фабком прыняў пастанову прасіць адміністрацыю дабавіць касетаў, але гэтая пастанова засталася толькі добрым пажаданнем.

Пытанні павышэння ЯКАСЦІ прадукцыі не заняті належнага месца ў рабоце прафсаюзных арганізацый. Брак на асобных прадпрыемствах набыў надзвычай вялікія памеры. На заводзе імя Домбаля па дугай пасудзе брак складаў у трэцім квартале 17,17 проц. замест дапушчаных 13 проц., папросу — 16,56 проц., замест 4 проц. Аналагічнае становішча з бракам па аўтаматнаму цэху фабрыкі «Пролетарская перамога» і лесазаводзе імя Молатава.

Там-жа, дзе вядзецца сапраўдная большэвіцкая барацьба за высокакласныя паказальнікі, там ёсць і поспехі. Цэхком этыкеравачна-каробачнага цэха, побач з сістэматычнай змаганнем работніц, арганізацыяй выставак прадукцыі бракаробаў, яе ўпускае ні аднаго выпадку браку без рэагавання. У гэтым цэху праведзен таварыскі суд над бракаробам Кручковай і выключаны з саюза Калыток і Міхаілевіч. Гэтыя людзі хутка спраўдзіліся і даюць зараз продукцыю высокай якасці. У выніку правядзімых мерапрыемстваў на лініі гадмадскасці ў гэтым цэху брак, які перавышаў у жніўні ўстаноўленую норму проц., і ў кастрычніку да 4,6 проц.

На жаль, лепшыя вопыты работы па забеспячэнню выканання вытворчых задач не пераносяцца ў адсталыя цэхі і прадпрыемствы.

Асабліва «вузкім» месцам у рабоце прафарганізацыі з'яўляецца кіраўніцтва і інструктаж прафоргаў. Не гаворачы ўжо аб фабкомах, многія заўкомы не ведаюць сваіх прафоргаў. На заводзе імя Домбаля заўком ні разу не склікаў прафоргаў з часу існавання гэтага інстытута ў пабудове прафорганаў. Таму большасць прафоргаў працуе вельмі слаба, і не таму, што не жадаюць працаваць, а таму, што не ведаюць што рабіць. Райпрафсавет зусім «забыў» пра існаванне прафоргаў, не даў ні аднаго канкрэтнага ўказання фабзаўкомам наконт работы з прафоргамі.

Асобныя фабзаўкомы ігнаруюць масавую работу на прадпрыемстве, падмяняюць яе адміністраваннем і парушаюць працоўнае заканадаўства. На «Пролетарскай перамозе», камбінаце «Камінтэрн» і фанерным заводзе пад выглядам часовых мерапрыемстваў па ліквідацыі прарыва ў выкананні прамфінплана ёсць спробы ўвесці ў сістэму звышчасовую працу і працу ў выходныя дні. Толькі ў апошніх лічбах верасня райпрафсавет зацікавіўся гэтай справай і спецыяльнай пастановай ўказаў фабзаўкомам і дырэктарам прадпрыемстваў на недапушчальнасць гэтых з'яўішч.

Райпрафсавет і фабзаўкомы не цікавіліся выдаткаваннем сродкаў, прызначаных на ахову працы і тэхніку бяспечнасці. З 77.323 руб., прызначаных для гэтай мэты, выдаткавана толькі 37.230 руб. Дырэкцыя бярэзінскага камбіната ўпарта ігнарэе пастанову прафкома наконт устанаўлення вентыляцыі ў аўтаматным цэху запалкавай фабрыкі. На электрычнай станцыі не агароджаны пасы і інш. Праўда, аховы працы і тэхніка бяспечнасці за апошні час, у сувязі з правядзеннем сталінскай эстафеты, пачалі пашыпацца, але коснасць, непаваротлівасць раду дыректараў і старшынь фабзаўкомаў перашкаджае скарыстанню ўсіх магчымасцяй для паляпшэння бытавых умоў рабочых. Чаго варты такі факт, калі кіраўніцтва бярэзінскага камбіната ўсе свае клопаты аб жыллёвых умовах рабочых звяло да таго, што спадзяецца на апрышане дзевяці квартар ад райсовета, а свой дом, з разлікам на пасяленне каля 200 чал., палічае незакончаным толькі таму, што дырэктар камбіната Міхейчык не пакланяцца загадзя аб набыцці ваконнага шкла і затыкоўкі гэтага памяшкання.

На камбінаце сярод усіх рабочых 71 проц. складаюць жанчыны работніцы. Задача прафсаюзнай арганізацыі — стварыць работніцам усе необходныя ўмовы, каб у максімальнай меры вызваліць іх ад хатніх клопатаў, асабліва па догляду дзяцей. Між тым існуючыя пры камбінаце яслі і ачаг не задавальняюць патрэб 20-ці проц. работніц. Фабком не праяўляе сваёй ініцыятывы і настойлівасці ў пытанні забеспячэння абслугоўвання людзмі ўсіх работніц.

Такія сур'ёзныя недахопы ў рабоце прафсаюзнай арганізацыі з'яўляюцца ў значнай ступені вынікам адсутнасці канкрэтнага кіраўніцтва з боку райпрафсавета. Старшыня РПС т. РЫКЛІН не адмовіўся яшчэ ад папярэдніх метадаў кіраўніцтва. Ён дакладна прытрымліваецца каляндарнага графіка пасяджэнняў прэзідыума РПС, рэгулярна выклікае старшынь фабзаўкомаў з усіх прадпрыемстваў і пачынае заседаць з 10 гадзін раніцы да 6-8 гадзін вечара. У гэтым пераважна і заключаецца работа райпрафсавета. Гаварылні і пісаніны шмат, а справы мала, бо за выкананнем прынятых пастаноў няма кагі троля.

Райпрафсавет сур'ёзна хварэе масабаязню. Аб гэтым гаворыць хоць-бы той факт, што на працягу гэтага года ні на адным прадпрыемстве не праведзена выязнога пасяджэння прэзідыума РПС.

Для характарыстыкі метадаў кіраўніцтва РПС правядзеннем важнейшых мерапрыемстваў не будзе лішнім праілюстраваць адзін дакумант. У сувязі з арганізацыяй склікання на 30 кастрычніка райнага злёта ўдарнікаў якасці і аўладання тэхнікай, райпрафсавет пасылае на прадпрыемствы паперку:

«Райпрафсавет паведамляе, што ў сувязі з падрыхтоўкай да раённага злёта ўдарнікаў якасці — герояў аўладання тэхнікай — райпрафсоветам створана брыгада для выканання раду работ па прадпрыемствах, звязаных з прадстаячым злётам.

На ваша прадпрыемства камандыравана...» (паказаны прозвішчы). Райпрафсавет просіць аказаць ім сваю дапамогу і садзейнасць у выкананні ўскладзеных на іх абавязкаў».

Гэта «выкананне раду работ», аказваецца, толькі ў тым і заключалася, што прысланыя на прадпрыемствы людзі заходзілі ў канторы, бралі лічбовыя весткі і вярталіся зноў назад. Такая «дапамога» ў падрыхтоўцы дала свае вынікі. Злёт ударнікаў па сутнасці правален. У памяшканні, дзе праходзіў злёт, не было ні аднаго лозунга, мабілізуючага на барацьбу за якасць прадукцыі і аўладанне тэхнікай. Ні аднаго самакрытычнага выступлення не было ў спрачках, за выключэннем выступлення двух дэлегатаў завода імя Домбаля. Каракей кажучы, дзеласая работа злёта была перавораана ў слаўнасную дакладчыкамі, лікуючае самахвальнае рапартаванне. Чаму-ж так адарыўся? Проста таму, што ў працэсе падрыхтоўчай да злёта работы райпрафсавет не даў ніякай установкі, не даў напрамка, на якім павінна была праходзіць работа злёта. Правал гэтага злёта з'яўляецца адлюстраваннем фармальна-бюракратычнага падыхода РПС да правядзення важнейшых мерапрыемстваў.

Пры такіх метадах кіраўніцтва з боку райпрафсавета прафсаюзная арганізацыя не справяцца з тымі вельзарнымі задачамі, якія стаяць перад ёй у галіне вытворчай работы і далейшага паляпшэння матэрыяльна-бытавых умоў рабочых мас.

Барысаўская партарганізацыя, сваёй большэвіцкай работай забяспечваючая ролю пярэдніцтва ў выкананні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній у вёсцы. Яна павінна значна ўзмацніць сваё кіраўніцтва барацьбой за прамфінплан, забяспечыць сапраўдную перабудову работы прафсаюзнай арганізацыі, рашуча выкарчоўваючы метады палярова-бюракратычнага кіраўніцтва ў рабоце прафорганаў.

Брыгада «Звязды»:
ІВАШЫН, ЗАРУБЕЖНЫ, ШМІДТ.

Першыя крокі палітаддзельца-жанорга

— З чаго пачаць?—такое пытанне паўстала перад тав. Крацэр—жаноргам палітаддзела Аршанскай МТС— у першыя дні яе работы.

А калі азнаёміўся тав. Крацэр з жыццём і работай калгасаў і ўстанавіла, што на кіруючых работах у калгасах амаль зусім няма жанчын, то пачаў шукаць з гэтага.

На ініцыятыве жанорга былі ўведзены ў склад праўленняў калгасаў «1 май», «Чырвоны ўсход» і інш. лепшыя ўдарнікі. Доўга страхаліся, не згаджаліся з прапановай т. Крацэр у калгасе «1 мая»:

— Дзе там жанчынам справіцца з такой адказнай работай, — гаварылі асобныя праўленцы.

Прыйшлося разбіць такія настроі.

У калгасе «Верны шлях», Баранскага сельсавета, гіне лён. Агроном Грамына скаўгі напіс акт аб тым, што калі належных мер не будзе ўжыта, увесь лён і валакно загіне. А старшыня калгаса Казлоў— ў вус не дуе. Давялася аб гэтым тав. Крацэр, і ў калгас да калгаснікі. Пачалі, паралісі, пачашылі выратаваць лён. А вечарам паставілі гэта пытанне на сходзе жанчын. І ўзяліся за работу. Звяшевыя Шышкова, Антонава і Пацкова правялі гутарку ў звяніках. У разультаце—лён быў прасушан, дагледжан аж дзіцці, і зараз калгас «Верны шлях» здаў ужо больш 30 проц. ільну і амаль увесь 10-12 нумара.

Тав. Крацэр пільна прыслухоўваецца да запатрабаванняў калгаснікі. Надоечы давялося ёй ісці ў калгас «Рабочая культура». На трозе сустрэліся калгаснікі. Пазнаёміліся, разгаварыліся

— Зайшлі-б вы да нас. Мы з другой брыгады, жывем за 2 кілометры ад цэнтральнага пасёлка. Ясляй у нас няма, хоць і памяшканне ёсць і дзяцей многа...

Некаторыя, праўда, недаверліва адносіліся: «Ну што яна нам дапаможа!» Але неспавер'е хутка знікла. Яслі былі арганізаваны А ніпер калгаснікі, сустракаючы т. Крацэр, не прамінуць сказаць:

— Заходзьце да нас чаўцей.

Пачала т. Крацэр і калгас «Зара». Там ёй расказалі калгаснікі-актывісткі аб куланкім шкодніцтве, аб бяздзейнасці праўлення, старшыні калгаса.

У гэты-ж дзень праўленне вынесла рашэнне аб выключэнні з калгаса Тарасевіча, былога кулака, які працаваў у рахункаводы і провёў шкодную работу. Выляпеў і брыгадзір Архіменка Сяргей, таксама кулак.

Выключную ўвагу тав. Крацэр адлае арганізацыі масавай работы сярод жанчын, асабліва тых, хто затрымліваецца ад працоўка ільну, капусніе бульбы і г. д., бо жаночая праца адыгрывае рашаючую роль.

9-та верасня т. Крацэр правяла злёт калгаснік-ударнік у Баранскім сельсавеце. На гэтым злёце першай атрымала слова ўдарніца з калгаса «Трэці год пяцігодкі» т. Матусевіч. Яна расказала як іх калгас дабіўся перамогі, закончыў апрацоўку і здачу ільну. Удзельнікі злёта параўнялі выкарыстаць вопыт і ўзялі на сябе абавязкі:

— да 15 верасня здаць першую партыю ільнаваалакна;

— да 5 кастрычніка закончыць здачу ільну, пры чым не ніжэй 10-12 нумара.

Тады-ж на злёце пастанавілі сабраніца яшчэ раз і праверыць выкананне гэтых пунктаў дагавора.

За пяць дзён да праверачнага злёта тав. Крацэр напісала ўсім удзельнікам першага злёта персональныя паведамленні аб тым, што 13 кастрычніка ў такім-та памяшканні, у столькі-та гадзін будзе праверка выканання ўзятых абавязальстваў. А за дзень да злёта—яна абышла некаторых калгасаў і сама праверыла ход апрацоўкі ільну.

Злёт паказаў, што абавязацельствы калгаснікамі Баранскага сельсавета выкананы з гонарам, асабліва ў калгасе «Партызан» і «Трэці год пяцігодкі». Яны поўнасцю здалі ільнавалакно, крычым выдзеляючае.

Не было на злёце дэлегатаў ад калгасаў «Чырвоны Кастрычнік» і «Чырвоны шлях»: пагаварыліся, бо да злёта яшчэ не распачалі апрацоўкі ільну. На заўтра ў гэтыя калгасы ад «1 мая» і «Чырвонага сцяга» былі накіраваны брыгадныя брыгады.

Такія результаты атрыманы ў выніку чулых адносін да калгаснікі, аперацыйнага кіраўніцтва іх работай, пастаўленай гнёмкі ім у выніку масавай праверкі гонарлівасці і самаабавязацельстваў. Гэта разумеюць калгаснікі і таму яны не забываюць пры сустрэчах з жанаргам сказаць:

— Заходзьце да нас чаўцей!

Д. КОНІК

Баявыя задачы масавай работы КК-РСІ

«Вялікія і ганаровыя задачы стаяць перад КК-РСІ, але для таго, каб гэтыя задачы рашаліся хутка і своечасова, КК-РСІ абавязаны праяўляць сапраўдную большэвіцкую ініцыятыву, цвёрдасць і самастойнасць у правядзенні сваіх рашэнняў, у абароне партыйнай лініі».

(«ПРАВДА»).

ЦКК-НК РСІ за апошнія гады значна актывізавала сваю работу, зрабіла яе больш канкрэтнай і масавай. Але ці ўсе мясцовыя КК-РСІ працуюць пры ініцыятыве ўлазе працоўных мас? Безумоўна, не. Аб гэтым з усёй яснасцю быў сказаны ў нядавным арт. «Правды» «Ператворым кожную КК-РСІ ў зоркае вока партыі». Не ўсе КК-РСІ змагаюцца за своечасовае правядзенне ў жыццё рашэнняў партыі і ўрада. Мы маем асобныя раёны, якія яшчэ да гэтага часу адлетаюць па выкананні важнейшых палітычна-гаспадарчых кампаній (выкананне прамфінплана, барацьба за паляпшэнне якасці прадукцыі, абежкажадачы дзяржаве, бульбапарыхтоўкі і г. д.) таму, што КК-РСІ не змаглі мабілізаваць актыў вакол гэтай работы. Узяць хаця-б Лёзненскую КК-РСІ. Яна работу з актывам праводзіць толькі пастановамі, у якіх падкрэслівае: «палепшыць работу з актывам», а на справе гэтай работай не кіруе. Усяго на раёну з 24 сельсоветаў маюць секцыі РСІ толькі 9. Работы в цёмнай кавалерыяй у гэтым раёне яшчэ яшчэ. На пастаўчаючыя сігналы з боку асобных работнікаў секцыі РСІ няма своечасовага рэагавання. Матэрыял старшыні секцыі РСІ Улатоўскага сельсавета т. Вейса аб злоўжываннях старшыні калгаса «Бязбожнік» Пукава—КК-РСІ пераслала ў міліцыю і на працягу больш 2 з палавай месяцаў аб гэтым не вынесена ніякага рашэння. Няма работы з актывам. Работнікі КК-РСІ тлумачаць гэта тым, што іх раённы камітэт партыі прымушаў да асобных сельсоветаў і калгасаў, не арэзумеўшы таго, што свае знаходжанне ў калгасах, у саўгасах і сельсоветах яны павінны былі скарыстаць для работы з актывам. З прычыны адсутнасці кантроля з боку шырокіх працоўных мас і сувязі з імі КК-РСІ, мы мелі тысячу тон апошнай ільнатрасты і 500 тон апошнага сена.

«Правда» зусім правільна ўказала мясцовым КК-РСІ на вялікае значэнне работы бюро скаргаў, як масавага органа кантроля. Трэба сказаць, што з боку Лёзненскага бюро скаргаў агладаюцца фармальна-бюракратычныя адносіны да листоў калгаснікаў і рабочых. На скаргу грамадзянкі Жук аб злоўжанні на яе штрафа старшынёй Страхкасы, бюро скаргаў пастанавіла: «Даць параду т. Жук падаць заяву ў Галоўсоцстрах». Бюро скаргаў зусім абыйшло пытанне аб удзеле шырокіх працоўных мас і актыва ў выкананні гаспадарча-палітычных кампаній (сяўба, уборка, абмалот здача збожжа дзяржаве і г. д.). У Гарадоцкім раёне ляжаць нерасследаваныя 500 скарг. Няма та актыва пры КК-РСІ няма. Былы загатчык бюро скаргаў т. Усвяццеў на запытанне, ні ёсць актыў, адказаў: «да мяне не было актыва і зараз пры мне таксама няма, да мяне была куча нерасследаваных спраў, і я іх таксама не расследаваў».

Не лепш справа ў Менскай КК-РСІ. Не пры ўсіх сельсоветах ёсць секцыі РСІ, няма груп садзейнічання, кантрольных пастоў бюро скаргаў, асабліва на вёсцы. Бюро скаргаў Мен. гар. КК-РСІ працуе дрэнна. Даволі прыведзі лічбу нявыкананых 300 скарг і 126 допісаў в газет. Актыў бюро скаргаў засмечан чужымі элементамі (кравічэнка), кар'ерыстамі (Каган, Шварц), якія падрываюць аўтарытэт бюро скаргаў РСІ, як масавага органа кантроля. Бюро скаргаў не ўключылася ў правядзенне гаспадарча-палітычных кампаній. Смалявіцкая КК-РСІ таксама не мае актыва. З 14 секцый РСІ пры сельсоветах, працуюць толькі 4. У Мазырскім раёне секцыі РСІ не былі ўключаны ў уборачную кампанію таму, што КК-РСІ недаацэніла палітычнай важнасці гэтага мерапрыемства.

Асобныя КК-РСІ па пытанні перабудовы чытуначнага транспарта амаль нічога не зрабілі. Крычаўская, Магілеўская КК-РСІ павінны былі праверыць падрыхтаванасць кліентуры і транспарта да асенняе перавозкі. Аднак, гэтага задання яны не выканалі. Маюць месца ацёнкі адносны да выканання дырэктыў ЦКК-НК РСІ аб арганізацыі кантрольных пастоў па нагляду за перавозкай збожжа і гародніны. Большасць КК-РСІ не канцэнтруюць сваю ўвагу на галоўных рашаючых для дагната перыяда пытаннях чытуначнага транспарта.

1933 год даў вялікія поспехі ў галіне сельскай гаспадаркі. Задача заключаецца ў тым, каб найлепш замацаваць гэтыя поспехі, своечасова здаць збожжа дзяржаве, своечасова засыпаць насенныя і страхавыя фонды.

Між тым, асобныя КК-РСІ мала ладзяць увагі гэтым пытанням і асабліва пытанню аб правільным размеркаванні даходаў паміж калгаснікамі, аб падрыхтоўцы калгасцага каня і г. д.

У як адну з новых форм масавай работы ЦКК-НК РСІ правяло кербоўку дабраахвотнікаў у актыў РСІ з калгаснікаў-ударнікаў. Завербавана 610 лепшых калгаснікаў - ударнікаў і ЦКК НК РСІ трымае з імі самую цесную сувязь. Да гэтага часу спытчана 1.860 інструкцыйных листоў па пытаннях сяўбы, уборкі, [illegible] і збожжадачы дзяржаве з канкрэтнымі заданнямі. Але трэба адзначыць, што многія КК-РСІ не замацоўваюць гэты актыў, ён аказаўся в канцэлярыцкімі пастамі і недастаткова арганізавалі іх работу. Мы маем вялікую колькасць ударнікаў-калгаснікаў, якія з'яўляцца нашымі актывістамі, якія добра працуюць, дапамагаюць КК-РСІ ўскрываць і выкрываць кажэнных вінаўных, сабатажнікаў, перапраўляюць. Але на жаль, мы маем КК РСІ, якія не кіруюць імі і не дапамагаюць ім у рабоце. Весь актывіста т.

РЫХТАВАЦЬ ВЫСОКАКВАЛІФІКАВАНЫХ ПЕДАГОГАЎ, УЗБРОЕНЫХ ТЭОРЫЯЙ МАРКСА-ЛЕНІНА-СТАЛІНА

Менскі вышэйшы педагагічны інстытут—адзін з буйнейшых падвузаў БССР. Інстытут рыхтуе выкладчыкаў па грамадзкіх дысцыплінах для тэхнікумаў, рабфакаў і трэніра канцэнтра ФЗД.

Доўгі доўгі час на радзе важнейшых дысцыплін у пед'інстытуце мы мелі прапагандыстаў класава-варожай, чужой пролетарыяту ідэалогіі. Гэта з'явілася вынікам выключнай засмечанасці прафесарска-выкладчыцкага персанала класава-варожымі элементамі, трацкістскімі, кулацка-эсэраўскімі, буржуазнымі элементамі. (Вітко́ўскі, Гесен, Рыўлін, Чарныўскі, Арцюхаў і г. д).

Гаралоскі камітэт партыі даў зусім правільную большэвіцкую ацэнку становішча інстытута. У гэтай ацэнцы было адзначана, што «пастаноўка выкладання, пастаноўка ўсей сістэмы выхаўчай работы ў інстытуце не забяспечвае падрыхтоўку і выпуск высокакваліфікаваных узброеных тэорыяй Маркса-Леніна-Сталіна выкладчыкаў грамадзкіх дысцыплін».

Старое кіраўніцтва інстытута, партыйная, комсамольская і прафсаюзная арганізацыі не зразумелі палітычнай сутнасці постановы ЦВК аб вышэйшай і сярэдняй школе. Увесь сэнс гэтай пастановы яны ўяўлялі толькі ў перахадзе на дэкцыйную сістэму, а на аместо лекцый, на партыйную, палітычную за восправасць іх, на арганізацыю выхаўчай работы сярод студэнтства яны не звярталі ніякай увагі. Партарганізацыі інстытута, на чале з бюро партканфліктыва, згубілі неабходнейшую большэвіцкую асаблівасць зараз, рэволюцыйную пільнасць. Уся сістэма партыйнай работы была пранізана дэкларацыйнасцю, аліберальнічанай, кіраўніцкам пасгуд, навядзенне жыцця групы, фаўкультэта.

Галоўнае зараз у арганізацыі педагагічнага працэса.

Арганізацыя падпрацэса, метады работы аказаліся самым забытым участкам работы ў інстытуце. Ледзе ўказанне партыі і ўрада аб метадах работы ў вышэйшай школе ігнаруецца. Прыводзім некалькі прыкладаў. Мар'ясіна, выкладчыца эканомгеаграфіі, замест лекцыі дае 20 мінутную, так званую, «установачку», астатні час студэнты самастойна чытаюць літаратуру ў не прысутнасці. Гэта рэцыдыў нядаўна асуджанага, пытанага а вышэйшай школы, праслаўтага лабараторнага метала. Тым часам, для Мар'ясінай, рашэнні партыі аб ліквідацыі гэтых метадаў у вышэйшай школе—не закон. Прафесар Перцаў ужывае спасабіўны метад выкладання. 20-30 мінут чытае лекцыю, а астатні час студэнты пад яго дыктоўку запісваюць слова ў слова прачытанае ім за гэтыя мінуты. Такі метад яўна шкодны, бо ён не прадукцыйна выкарыстоўвае галавіны, адведзеныя на лекцыі, не пад штурхоўвае студэнтаў на самастойную глыбокую працу над матэрыялам. І не выпадкова адсталая частка студэнтаў падпрымлівае такі метад выкладання. Што-ж думае кіраўніцтва кафедры, на вучальная частка інстытута? Два гады ў інстытуце вядзецца дыскусія аб перпаўскім метадзе, а кафедра і навучальная частка стаяць у баку, не адважваюцца прапанаваць праф. Перцаву змяніць свае метады выкладання.

Выкладчыкі: гісторыі народаў СССР Карнейчын, гісторыі Беларусі Якубчык вельмі часта чытаюць лекцыі, не падрыхтаваўшыся да іх. Яны плавае ць на паверхні, не вырашаючы асноўных цэнтральных пытанняў тэмы. Зразумела, што такія лекцыі—дарэмная трата дарагога часу студэнтаў. Выкладчык эканомстатыстыкі Спупскі цэлых 18 лекцыйных гадзін (усяго адведзена яму 60 гадз.) даказваў студэнтам складанасці раскладаў, часта вельмі бязглуздых, нічым не займаючыся, не кіруючы усёй работай факультэта. Пераважная большасць кафедраў па сутнасці не працуюць. Няма кантроля з боку кафедраў над ідэйна-метадычнай пастаноўкай дысцыплін, як гаворачы ўжо аб навукова-даследчай рабоце, якая павінна была весціся кафедрамі. Інстытут—буйнейшы пэнтр педагагічных навуковых сіл—адарваўся ад масавай школы, замкнуўся ў сваіх чатырох сценах. У інстытуце шмат маладых навукова-педагагічных работнікаў, якія вядуць упэрпыню педагагічную работу. Ім патрэбна дапамога больш вопытных прафесараў—выкладчыкаў. Такой дапамогі ім не аказваюць. Секцыя навуковых работнікаў стаіць у баку ад вытворчай работы, а кіраўніцтва інстытута не здолела арганізаваць ім гэту дапамогу.

Партарганізацыя інстытута не вынесла для сябе ўрокаў з мінулых падзей у інстытуце, не стала ў авангардзе барацьбы за правільную арганізацыю педагагічнага працэса, за высокую якасць вучобы. Яна ўсё яшчэ займаецца разважаннямі, а сапраўдная большэвіцкая перабудова работы няма. Чыстка партарганізацыі інстытута павінна паслужыць выходным пунктам для карэннай перабудовы работы ўсяго інстытута, павінна мабілізаваць усю партыйную арганізацыю і беспартыйныя масы студэнцтва на барацьбу за высокую якасць вучобы, за падрыхтоўку высокакваліфікаваных ідэйна-вытрыманых педагогаў.

Е. П.

НАЦМЕНАЎСКІМ СЕКЦЫЯМ НЯМА ПАТРЭБНАЙ УВАГІ

З-за шэрагу важкіх адносін да ўкамплектавання нацменаўскіх груп, яны вельмі малалікія. На трэцім курсе яўрэйскага эканамічнага аддзялення—7 чалавек, на другім полэскім—11 чал. У 1931 годзе арганізавалі яўрэйскую групу на гістарычным аддзяленні. Праіснавала яна шэўтары гады і была зліта з беларускай, хоць большасць студэнтаў не ведала беларускай мовай. І такое яўнае скажэнне ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі знайшло падтрымманне з боку бюро партканфлікта. Бюро дало ганкцыю на ліквідацыю яўрэйскай групы. Вельмі часта нацменаўскія групы застаюцца без аўдыторыі. Кіраўніцтва інстытута, дэканы факультэтаў зусім не цікавяцца іх работай.

Зусім невыстарчальна праведзена работа па палялішэнні матэрыяльна-бытавога становішча студэнцтва. Новапабудаваны барак без сцяны, вакон не замкнілі, у пакоях брудна і вельмі цесна. Абеды ў сталоўцы надзвычай дзікай якасці. Адкрыты ЗРК школьні не палепшыў забеспячэння студэнтаў. МЦРК, у ведамні якога ЗРК знаходзіцца, абсалютна нічым яго не снабжае.

Дзе і ў чым ляжаць прычыны такога становішча ў інстытуце? Дырэктар інстытута тав. Воўкаў, загадчык навучальнай часткі т Хейфец не сталі сапраўднымі кіраўнікамі і арганізатарамі інстытута, не арганізавалі стройнай, прадукцыйнай сістэмы арганізацыйнага і метадычнага кіраўніцтва інстытутам, яны кіруюць інстытутам папярова, загадамі, седзячы ў кабінетах, не ведаюць жывых людзей—выкладчыка, студэнта. Яны не правяраюць работу кафедраў, выкладчыкаў. Выкананне загадаў ніколі не правяраецца. Дэканы факультэтаў апрача закачэнне гэтай дысцыпліны і яе змест.

Па некаторых дысцыплінах выкладчык са студэнтамі зусім не праводзіць групавой прапрацоўкі матэрыяла. Вельмі нядбайна, а часта па-галавацяпску складаюцца расклады лекцый. Так, нечакана дзень падрад праведзяцца лекцыі, а праз дзень-два ўжо канферэнцыя па гэтай-жа дысцыпліне. Такім чынам, студэнты пазбаўляюцца магчымасці прапрацоўваць матэрыял. А літаратуру рэкамендуюць у такой колькасці, што няма ніякай фізічнай магчымасці прачытаць яе за пятэры дні, а не то што прапрацаваць. Так, студэнт 3-га курса павінен прачытаць у дзень 183 старонкі літаратуры класікаў марксізма. Сюды не ўваходзіць літаратура па іншых, невядомых дысцыплінах, часта студэнты, не ўмеючы самі выбраць набходную літаратуру, зусім не чытаюць яе.

Алінакі студэнтам за прапрацаваныя тэмы або за ўвесь курс павінны быць стымулам для лепшай прапрацоўкі, для барацьбы за высокую якасць вучобы і тэму яны павінны быць рэзультатам сапраўднай праверкі выклад чыкамі ведаў студэнтаў.

Не вельмі добра з ідэйным зместам, партыйнай завостранасцю, мэтаімкнёнасцю лекцый некаторых выкладчыкаў. Так, выкладчык дыямата т. Мацюкевіч тлумачыць дуалізм у філасофіі Дэкарта, як двоінную палітыку, і ў прыклад прыводзіць фашызм у Германіі. Для Мацюкевіча фашызм не з'яўляецца адкрытай дыктатурай буржуазіі, а нейкай дзійста цю. Няма валюнчага большэвізма ў тлумачэннях па гісторыі Беларусі ў тав. Якубчыка. Да гэтага часу няма профіля для крытычна-творчай групы літфака і для педолага. І невядома ягоўна, каго і з якой спецыяльнасцю рыхтуе літфак.

АЎЛАДАЕМ ТЭХНІКАЙ ТРАНСПАРТА!

НА ЗДЫМКУ. РАБОЧЫЯ ПАРАВОЗНАГА ДЭПО (СМАЛЕНСК) ВЫВУЧАЮЦЬ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ІНЖЫНЕРА РЭМОНТ ДЭТАЛЯЙ ПАРАВОЗА.

УСЕБЕЛАРУСКІ ПАХОД ЗА ВЫСОКАЯКАСНУЮ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЮ

У саўгасе „Каралёва" адыход маладняка зведзен да мінімума

ВОПЫТ ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ—У КОЖНЫ САЎГАС, НА КОЖНУЮ ФЕРМУ

На злётах ударнікаў соцыялістычнай жывёлагадоўлі

Нядаўна скончылі сваю работу злёты ўдарнікаў соцыялістычнай жывёлагадоўлі саўгасаў менскіх малочна-прамысловага і свінаводчага трестаў.

Злёты паказалі, што саўгасы малочна-прамысловага трэста сталі ў гэтым годзе асноўнымі пастаўшчыкамі мяса і малака. Праведзена вялікая барацьба з класава-варожымі шкодніцкімі элементамі ў саўгасах. Толькі за 1933 год вычышчана да 200 шкодніцкай і чужакоў. Саўгасы ўмацаваліся лепшымі кадрамі рабочых.

Але злёты разам з тым паказалі, што МТФ і СТФ ва многіх саўгасах ягоўна не сталі цэнтральнай галінай гаспадаркі, ім не аддаюць ягоўна той увагі, якой яны заслугоўваюць.

Фермы ягоўна не ўключыліся на спраўе ва ўсебеларускі конкурс-паход за соцыялістычную жывёлагадоўлю. Большасць МТФ і СТФ не рыхтуюцца да зімы. У такіх свінагаўгасах, як імя Молатава, Негарэлае, Дрыбіна нічога не зроблена, каб ацяплець памяшканні, каб падрыхтавацца да вымоўга перыяда.

Дырэктары саўгасаў пасылаюць працаваць на МТФ не лепшых ударнікаў-рабочых, а тых, хто не адрэдаў сябе ў паляводных брыгадах. На работу на ферме часта глядзяць як на «пакаранне». Дырэктар саўгаса Цытва проста гаворыць рабочым, што на скотным двары павінны працаваць толькі дурні. У саўгасе Ануф рава дырэктар месяцамі не бывае на ферме. У саўгасе Косінава ферма не забяспечана вадой, пачалі капаць студню і не скончылі.

— Дырэкцыю не турбуе тое, што падыходзіць зіма і невядома дзе будзем паіць кароў—гаворыць жывёлавод саўгаса Косінава тав. **МЯЛЕШКА**, —за маладняком у нашым саўгасе ніхто не назірае, і сапраўдная большэвіцкая перабудова работы няма. Чыстка партарганізацыі інстытута павінна паслужыць выходным пунктам для карэннай перабудовы работы ўсяго інстытута, павінна мабілізаваць усю партыйную арганізацыю і беспартыйныя масы студэнцтва на барацьбу за высокую якасць вучобы, за падрыхтоўку высокакваліфікаваных ідэйна-вытрыманых педагогаў.

Е. П.

У радзе саўгасаў ніякай увагі не аддаюць кармленню кароў. Корміць як папала і калі папала. У дачы кармоў—поўная ўраўнілаўка, няма норм у залежнасці ад удойлівасці. Замест усяго гэтага маюць месца такія агідныя факты, як біцьцё кароў палкамі.

У выніку агідных адносін да захавання маладняка адыход па саўгасах малочна-прамысловага трэста дасягае 20 проц.

Не лепшае становішча ў саўгасах Менскага свінаводтрэста. І там адыход маладняка вельмі вялікі, даходзіць да 30 проц. Злачынныя адносіны да стада, да барацьбы за эканомічны прыбытак ў саўгасе «Бабы» да знішчэння паловы маладняка. Дырэктар Матусевіч мепи усяго цікавіцца свінарнікамі. У хлявах брудна і сыра.

Дэлегатка злёта **АБУХОВСКАЯ** расказвае пра парадкі ў саўгасе імя Молатава. На ўсю ферму ёсць толькі 2 вазы, 1 ліхтар, а лапат, каб счышчаць свінарнік, зусім няма. Свінаркі жывуць за 2-3 клм. ад фермы. Вадома, які можа быць догляд! Ферма ягоўна не ўцеплена, няма печы, не ўстаноўлен кормазапарнік. За ўсё лета дырэктар ні разу не прыйшоў на ферму, такое-ж становішча ў саўгасах Негарэлае і Вішнёўка.

Рабачкомы саўгасаў не вядуць барацьбы за палепшэнне ўмоў рабочых МТФ і СТФ. Яны часта толькі тым і займаюцца, што штампуюць загады дырэкцыі.

Мы сёння друкуем выступленні лепшых ударнікаў — удзельнікі злёта. Іх вопыт сапраўды ўдарнай работы павінен быць перанесен на ўсе саўгасы.

Разгортваннем конкурса-паходу за соцыялістычную жывёлагадоўлю дабіцеся паспяховага заканчэння падрыхтоўкі да зімы.

РУЗЯ РАБІНСКАЯ РАССКАЗВАЕ...

Руэя сядзела на злёце і абуралася, калі гаварылі, што ў саўгасе Покрышава адыход цялят дасягае 43,2 проц., а ў саўгасе Дурылічы—32,9 проц.

У саўгасе Каралёва, дзе Руэя Рабінская пяты год ужо выпайвае цялят, вынікі зусім іншыя, там адыход зведзен да мінімума. У гэтым годзе, быў толькі адзін выпадак, што здохла цяля. Аб гэтым ледзь не са слязамі на вачах апавядае Руэя.

— Такое яно было весёлае, слаўнае, увесь час брыкала. Не магу пры думаць, што здарылася з ім. Выпусціла кагуліць, цяля пабегла, завалілася і канец... Ніяк не забуду гэтага выпадка.

Руэя расказвае, як яна выпайвае цялят.

— У гэтым годзе з 66 цялят прапала адно, а 65—весёлыя, растуць на славу. Я паю іх рэгулярна—тры разы ў дзень. Даю цёплае пойла, каб цяля не магло перастыць. Цялятнік у мяне заўсёды праветрываецца, сухі, чысты.

Пасу я летам цялят на сухадольных сенажацях, а не на балотах, дзе яны могуць заразіцца глістамі і захварэць. Калі яны вырастаюць, я іх перадаю іншым работнікам. Так праз мае рукі прайшло за чвэрць год амаль усё саўгаснае стада.

Рабінская прыпамінае род характэрных фактаў у сваёй рабоце.

— Было гэта зімой. Цяля не брала пойла. Пашла да доктара. Прыйшоў ён, паглядзеў і гаворыць: «Нічога, пройдзе». А мяне ўсё не варушна, баюся, як бы яно зусім не злягло. Хажу да доктара, прашу, каб ён паглядзеў зноў. Доктар смяецца: «Чаго ты, Руэя, гаворыць, турбуешся? Гэта-ж не дзіцё, выдаравае. Я лічу, што ён не так кажа. Цяля, гэта тое-ж дзіцё. Не прыглядзь за ім як след, дык яно і захварэе.

Быў яшчэ такі выпадак. Адзін бычок заўсёды аніваўся. Потым яго качынала пушыць. Таму я не давала яму піць уволю. Калі-б я яму дала піць, колькі ён хоча, ён бы заныў, а так вырас добры бычок. Да кожнага цяляці трэба падыходзіць уважліва і вожаць, што яму можна даць і чаго нельга.

Рабінская Руэя падрыхтавала ўжо цялятнік да зімы. Жывёла забяспечана кармамі. За добры догляд, за захаванне пагалоўя Руэя атрымала на злёце першую прэмію.

В.

„Сакрэты" МТФ „Комунара"

У саўгасе «Комунар» я працую з 1917 года. Даяркай я ўжо сёмы год За гэты час я пераканалася, што няма дрэнных кароў, а ёсць дрэнныя даяркі, скотнікі, пастухі. Карова, як тое дзіця, любіць ласку, сваячасовы і добры догляд, чыстату.

На нашай ферме 105 дойных кароў. Каровы простай пароды, бралі мы іх з мясазагатоўчых пунктаў. Удой нашай каровы ў гэтым годзе мы давялі ў сярэднім да 5½—6 літраў у дзень. Гэта вышэй, чым у іншых саўгасах Менмалаграмтрэста. Мы дабіліся такога ўдою тому, што па пор ме, у адзін і той-жа час даем корм, поім і даём кароў. Карова атрымлівае сену па ўдойлівасці, ураўнілаўкі ў нас няма.

Наш працоўны дзень заўсёды пачынаецца а 3-й гадз. раніцы. У гэты час мы даем каровам падкормку, саскрабаем гной, вымятаем і пасцілаем абору тырсай, каб падлога не была вільготнай і слізкай. А 4-й гадзіне пачынаем дойку кароў, пасля сепарыруем малако і ідзем на адпачынак. Да 10 гадзіны раніцы каровы ходзяць на пашы. У 10 гадзін разліваем каровам брагу, раздаем падкормку. У 11 гадз. раніцы даём кароў другі раз, падчышчаем абору і пасцілаем тырсай. Каровы ідуць на пашу, а мы на абед. У трэці раз даём іх а 6-й гадзіне вечары—і наш працоўны дзень канчаецца.

Перад даеннем мы заўсёды падмываем каровам вымя цёплай вадой, а не сцюдзёнай, як гэта робяць у іншых саўгасах.

Мы даглядаем па 18 кароў. Зарыла ту атрымліваем адзельна ад кожнага літра малака і ад галавы за догляд. Кожная даярка імкнецца, каб яе каровы давалі больш малака, былі лепшыя на выгляд. У мяне зараз 16 дойных кароў. Яны даюць у дзень 116 літраў малака. У мяне ёсць некалькі «рэкордсмэнак» па ўдою. Я гаджуся сваёй «Апшенай», якая мне пасля аплода давала па 20 літраў.

Мы падрыхтаваліся сустрэць зіму. Ацяплілі аборы, абкітавалі вокны. Наша стада поўнасцю забяспечана грубкамі і сакавітымі кармамі.

Я яшчэ раз гаварэру, што кароўу трэба любіць, за гэта яна адплаціць арамацным тлустым малаком.

РАПТУНОВІЧ МАРЫЯЛЯ—даярка саўгаса «Комунар» (Заслаўскі раён)—на злёце атрымала першую прэмію.

Даглядаем, як сваіх

У саўгасе СІНЬЧА, Пухавіцкага раёна, ў мінулым годзе палова маладняка загінула. У гэтым годзе справа не палепшылася—адыход складаў 47,7 проц. Прычыны крыюцца ў дрэнным даглядзе свіней, нядбайных адносінах да парасят, у ігнараванні зоаветмінімума.

Я першая пачала барацьбу з адыходам, калі ў ліпені г. г. стала брыгадзірам. Што я зрабіла? Свіней мы ўзяліся даглядаць як сваіх. Рэгулярна тры разы ў дзень іх кормім, тры разы мяняем мінеральную падкормку, рэгулярна выганяем на прагулку, два разы праветрываем і чысцім свінарнік. Для свіней па ўказанні зоатэхніка складаем рацыёны, ежу солім.

Наша брыгада ўвесь дзень праводзіць у свінарніку. Ноччу заўсёды вартую я, прымаю апаросы. За чатыры месяцы ўпартай работы мы дабіліся, што пры апаросе бывае ў сярэднім на матку 8,3 парасёнка. Адыход парасят зусім знішчан. Я даю тым-жа самыя кармы, што і астатнія свінаркі, але мае парасяты пры ад'ёме меншы 12 кіло не важаць. Вялікае злачынства, калі ў саўгасе зараз столькі парасят прападае.

Я цвёрда ўпэўнена, што ўся справа зараз у людзях. Треба свіней даглядаць як сваіх. Мой свінарнік ужо гатоў да зімы.

ГОРБАНЬ АРЫНА—брыгадзір саўгаса «Сіньча», яе брыгада на злёце прэміравана 4-х месячным парсюком і 200 руб. грашыма.

ГАСПАДАРЧАЕ ВОКА НА ФЕРМЕ

У нашым калгасе «Чырвоныя ўсходы», Баранскага сельсовета, мы па-ўдарнаму змагаліся за высокі калгасны ўраджай, за заможнае калгаснае жыццё. Наш працадзень важыць 4,5 кгр. збожжавых культур. Такія рэзультаты ад сваёй працы мы маем таму, што важнейшыя сельска-гаспадарчыя работы правялі датэрмінова і высакаякасна.

Таксама датэрмінова мы выканалі свае абавязкі перад дзяржавай па здачы збожжа, бульбы, мяса, малака.

Усё гэта не перашкаджае нам добра даглядаць калгасную жывёлу. Наша калгаснае стада налічвае 107 штук буйнай рагатай жывёлы. Работа на малочнай ферме пераведзена на здзельнічыну. Нашы даяркі—Васіленка Алёна, Бародова Уліта, Цітова Ганна і Шуткова Наста даглядаюць па 10 кароў і атрымліваюць працадні ў залежнасці ад надоенага малака.

Асаблівую ўвагу мы аддаем гадоўлі маладняка. На нашай ферме 13 трохгадовых цёлак, 17 двухгадовых і 31 сёлетняга маладняка. За цялятамі ў нас даглядаюць лепшыя ўдарніцы Бацюкова Аксіння і Васіленка Домна. Іх работа таксама пераведзена па здзельнічыну: за кожныя 7 кіло прыросту яны атрымліваюць адзін працадзень.

У рэзультаце мы маем такія вынікі: за адзін толькі месяц нашы 30 з лішнім цялят у сярэднім даюць па 16 кіло прыросту. Ні адно цяля у нас не загінула.

Зараз мы паставілі перад сабой задачу—забяспечыць сваёй жывёле сытную ежу і цёплую зімоўку. Немі ўжо засілаславана звыш 200 тон бульбоўніка і адыходаў гародніны. Такім чынам на зіму ў нашых кароў будзе вялікі выбар ежы: сена канюшынае і лугавое, аўсяная і ячменная салома, сілас, буракі, бульба і амаль па 60 кіло мукі на адну галаву.

Нашы каровы і цялята да Кастрычніцкіх свят будуць мець прасторнае, светлае і цёплае памяшканне.

Загадчык МТФ калгаса «Чырвоныя ўсходы» **ЛЯШНЕЎСКІ.**

ПЛАТОН ГАЛАВАЧ

АД ПАВЕНЦА ДА САРОК

«Голубым осколком диабаза
Наше слово падает в века».

* * *

Перад мной карта поўначы СССР.

Я гляджу на прасторы, што паміж Ленінградам і Архангельскам і выразна бачу вялікі водны шлях, якога няма на геаграфічных картах, але які ёсць у рэчаіснасці, шлях, па якім ідуць совецкія караблі.

Сённешні шлях ад Ленінграда да Архангельска, створаны пабудовай Беламорска-Балтыйскага воднага шляха, каранцей ад старога ў тры з паловай разы, каранцей на чатыры тысячы кіламетраў. Але значэнне канала не толькі ў гэтым.

З яго частак былой царскай Расіі Карэлія была краінай самага павольнага эканамічнага развіцця, не гледзячы на свае вялізарныя прыродныя багацці, якія ляжалі нікрантымі.

Расійскія ўрадавыя колы вялі палітыку ізаляцыі поўначы, палітыку кансерваці не багацця, пераварваўшы Анежскае возера ў паўночны тупік унутранай сеткі водных шляхоў.

І краіна, поўная прыродных багацяцяў, заставалася тыповым закінутым, глухім кутом, якімі так багата была расійская імперыя.

Але з Кастрычніцкай рэволюцыяй прышлі новыя, поўныя творчай энергіі і ініцыятывы людзі. Яны прынеслі ўсвет ідэю перабудовы сацыяльнага лада, ажыццяўленне вялікай ідэі дыктатуры пролетарыята і, разам, прынеслі і ідэю больш разумнай і больш мэтазгоднай для чалавека перабудовы прыроды сваёй вялікай краіны.

А ў лістападзе 1931 г. па падставе багацейшых матэрыялаў, атрыманых ад сістэматычнага вывучэння поўначы, пастановай урада СССР на АДПУ было ўскладзена будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала.

У тым-жа месяцы 1931 г. першыя ўзрывы дынаміта парушылі адвечную зімнюю цішыню карэльскіх азёр. Так пачалася рэалізацыя мысліі таварыша Сталіна, якому належыць ініцыятыва будаўніцтва ББВШ, так пачалося ператварэнне ідэі ў рэчаіснасць.

І ўжо ў чэрвені 1933 г. АДПУ рапартавала т. т. Сталіну, Кагановічу і Молатаву пра скончэнне пабудовы канала.

Гэтым пачалася новая эпоха ў жыцці Совецкай поўначы, Совецкай Карэліі і новая слаўутая старонка ў гісторыі развіцця водных шляхоў СССР.

Злучаючы праз Марыінскую водную сістэму Волгу, Нэву, Каспійскае, Белае і Балтыйскае мора — Беламорска-Балтыйскі шлях—кладзе пачатак ажыццяўленню адзінай воднай сістэмы СССР, сістэмы водных шляхоў, якімі пойдуць па ўсім прасторы Совецкага саюза караблі, гружаныя багацямі поўначы, прадукцыяй прамысловасці Карэльскай АССР, якая пачала свой рост навокал канала, якая на працягу другой пяцігодкі ўзбагаціцца 29 буйнейшымі прадпрыемствамі лесапільнай, папяровай, пэлюлёзнай, дрэваапрацоўчай, горнахадабываючай, горнахімічнай, металургічнай, рыбнай і судна-будаўнічай прамысловасці.

Разам з гэтымі прадпрыемствамі будзе пабудавана некалькі гідра-электрастанцый агульнай магутнасцю ў 162 тысячы кілават, якія дадуць энергію заводам і фабрыкам, гарадам і калгасам Совецкай Карэліі.

А разам гэта складае пачатак небывалага дагэтуль эканамічнага і культурнага росквіта былой глухой украіны расійскай імперыі, сённешняй Совецкай Карэльскай рэспублікі.

* * *

А палове семнаццатай гадзіны 19-VIII пасля гутаркі з інжынерам Мацілка, мы на параходзе «Анохін». Параход гатоў, каб адплыць. На прыстані людзі. Грае аркестр. Арганізатары нашай паездкі размяркоўваюць нас па каютах. Спяшаючыся, аглядаем свае месцы ў каютах і зноў на палубу. На палубе халаднавата. Мы выехалі, шмат хто на-летняму, па сваім хатнім надворі, а тут восень і халодны вецер. Хутаемся ў плашчы. Арганізатары паездкі прадбачылі і гэта. Каму холадна — далі на час паездкі душагрэйкі. Тут-жа на палубе мы апранаем іх і тады ўжо смялей стаімо пад ветрам.

Нясцынна грае аркестр. Убіраюць з берага на параход перакідны мосток і параход адыходзіць. Тады мы бачым шырокай паласой за намі след парахода, чуем усплескі валы за бортам і ўніз роўны гул машын. Аркестра не чуваць, гукі аркестровай музыкі, перачуваць, знікаюць недзе далёка ад нас. Пакідаючы далёка за сабой ад нас. Пакідаючы далёка за сабой прыстань, параход ідзе насустрач шырокаму прастору возера, над далёкімі берагамі якога ледзь бачны сінеюць лясы. А наперадзе далёка яшчэ паміж лесам прасвет. Недзе там Павяненцкі порт, недзе там параход «Анохін» пройдзе за першыя вароты шлюзнае камеры, каб пачаць свой уздым на Павенчанскую лесвіцу, і мы дапытліва ўзіраемся ў захмараную далеч.

Вяземскі — інжынер, які вучыўся ў совецкай ВНУ. Папаў ў палон контрэволюцыі і быў асуджан за шкодніцтва па арт. 58-7. Але ў 1932 г. Вяземтва па арт. 58-7. Але ў 1932 г. Вяземтва вызвален. Ён аўтар арыгінальных плацін, пабудаваных на Маткожні. Ён працаваў выключна добрасумленна. Ён надзвычай уважліва выконваў складанейшыя работы. Гэта адзначана ў пастанове ЦВК СССР пра ўзнагароду орэнамі працаўнікоў, інжынераў і кіраўнікоў будаўніцтва Беламорскага канала імя тав. Сталіна, Гэтай-жа пастановай тав. Вяземскі ўзнагароджан орэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Наша гутарка з тав. Вяземскім — гэта пытанні і адказы. Першым было пытанне пра ўцекачоў. Ці былі факты ўцякання, дэзэртырства з будаўніцтва? Якая ахова была?

Яшчэ ў Маскве тав. Фірын гаварыў з намі пра гэтыя-ж пытанні. Тое-ж гаворыць цяпер і т. Вяземскі і мы з захапленнем слухаем.

На будаўніцтве канала працавала некалькі дзесяткаў тысяч чалавек — былых зладзеяў, бандытаў, кулакоў, шкоднікаў і да іх падобных. Палова з іх гэта былі людзі, асуджаныя за контрэволюцыйныя ўчынкі. Будаўніцтва адбывалася ў непасрэднай блізкасці мяжы з фашысцкай Фінляндыяй. І пры гэтых умовах была абсалютна пазначная ахова, якая на 50 проц. складалася з саміх зняволеных.

— Фактаў дэзэртырства было так мала, што ім, — кажа тав. Вяземскі пра кіраўнікоў будаўніцтва, — бескарысна было трымаць вялікую варту і варта, нарэшце, была зведзена да зусім незначнай колькасці. Апрача ўсяго людзі з аховы штодзень выходзілі на працу, склаўшы свае брыгады, бо ім не было чаго рабіць па сваім непасрэдным прызначэнні.

Мы думаем пра тое пяломна вялікае, што трымала людзей на будаўніцтве. Імя гэтаму — праца. Разумна арганізаваная праца. Праца не на капіталіста-эксплаататара, а на самі сябе, на ўсю краіну. І давер'е. Давер'е, якое правяла ў адносінах да іх краіна, даручаўшы выкананне такой грандыёзнай задачы.

— Нас усіх аглушыла давер'е, — кажа Вяземскі. — Ды чаго таіць. Усе мы прышлі на будаўніцтва з некаторай насцярожанасцю, з некаторым недавер'ем і калі-б над намі стаяў чалавек з аховы, нас, інтэлігентаў, гэта прымечвала-б маральна і мы, калі-б і працавалі, дык працавалі-б дужа дрэнна, павольна, а крымінальнікі пры такіх умовах зусім-бы не пашлі на працу.

Тав. Вяземскі апавядае, як спачатку быў са старымі салаўчанамі прыязеен у лагер і стары салавецкі дух. Тых, хто заклікаў на працу, салаўчане сустракалі ў штыхі, не хацелі пра будаўніцтва і слухаць, гаварылі, што будаўніцтва можна правесці толькі на чалавечых касцях. А праз які час ад гэтага «салавецкага духу» і следа не засталося.

Справа ў тым, што людзі, выбітыя ў мінулым з жыццёвай каляіны, людзі, на якіх ціснула старое, якія на многа год не адчувалі над сабой цвёрдай глебы, якія, у прыватнасці крымінальнікі, большую частку жыцця правялі ў турмах, чым на волі, якія ўсё жыццё праялі «па ліпе», якія рызыкавалі ў дзень выйсці на вуліцу, гэтыя людзі на канале менавіта адчулі ў сябе пад нагамі вельмі цвёрдую глебу, а ў руках працу, сапраўдную працу.

Нам расказалі пра маладога хлапца-рэцыдывіста. Калі ён апынуўся ў лагеры, дык здраву надумаўся ўцячы і пачаў рыхтавацца ў дарогу. Гэта заўважылі. Але яму нічога не сказалі, не дакаралі яго, а, ведаючы, што ён добра малюе, даручылі яму ілюстраваць насценгазету. Ён захапіўся працаю і не ўцёк, а пасля паехаў у Ленінград на вучобу.

А вось другі выпадак. У лагеры быў адзін мастак. Да лагера займаўся тым, што краў з музеяў рэдкія экземпляры каштоўнейшых карцін, замалёўваў іх такім-сякім пейзажам, каб не заўважылі і прадаваў карціны ў замежныя дзяржавы. За гэта і папаў у лагер. «А ў лагеры, — піша пра мастака адзін з журналістаў, — надумаўся мастак на волю бегчы. Дастаў «ліпу», падбіў хлопцаў, выбраў тэрмін. Але калі прыйшоў тэрмін, мастак маляваў для клуба дэкарацыі да пастаноўкі «Яўгені Анегін». Сабраў ён падарожнікаў сваіх і просіць, каб пачакалі, пакуль другі акт дамалюе. Захапіўся, маляваў. А як дамаляваў другі акт, тады зусім запікаўся, захацелася паглядзець і «самую пастаноўку. Сябры ўцякалі, а мастак так і застаўся, а пазней яго вызвалілі».

* * *

Горад Павяненц. Вось ён наперадзе крыху ўлева ад нас.

Яшчэ колькі хвілін і мы пад'едзем да першага шлюза Павенчанскае лесвіцы. А пакуль што ўглядаемся ў далёкія будынкі горада, гэтага даўняга паселення раскольнікаў. Хто з нас ведаў пра гэты горад? «Павянец — усяму свету канец» — існавала такая прыказка. Уяўнікла, гэта прыказка з той прычыны, што Павяненцкі порт, даўні стары порт да часу пабудовы канала быў крайнім паўночным пунктам, у які ўпіралася Марыінская водная сістэма. Гэта і быў так званы Анежскі тупік.

Паступова горад застаецца ў баку ад нас, а наперадзе перад намі замкнуты берагавы круг. У напрамку, куды кіруецца параход, мы бачым дзве светлыя пірамідальныя вежы, а паміж імі знаходзім чорную, квадратовую плямі-ну шлюзавай брамы. Там пачынаецца Павенчанская лесвіца. Углядаемся і бачым, як па простай лініі перад намі, сапраўды ступенямі лесвіцы адзін над другім чарнеюць чатырохкутнікі шлюзавых варот. Адзін, другі, трэці. Яшчэ і яшчэ. Апошні высока перад намі і ледзь відзён.

Аднекуль паўстаюць над берагамі з левага боку новыя з жоўтага сасновага бярвення будынкі. Прыгожа, уважліва збудаваныя катэджы, гэта эксплаатацыйныя будынкі і будынкі—кватэры для тых, хто працуе на канале цяпер. Ледзь прыкметна, як мітусяцца над берагам вялікім натоўпам людзі. Параход падае сігнал. І ў звычайным сігнале параходнага гудка кожны з нас чуе нешта большае, чуе і свой нявыказаны радасны голас пітання да людзей, якія пабудавалі канал, якія на многа ўзбагацілі нашу краіну. Вачыма шукаем чэкіста тав. Фірына, гэтага выдатнага арганізатара і педагога. Ён усхвалёваны і радасны стаіць над самым краем барта і, узіраючыся ў далёкі яшчэ берег, тулы, дзе чарнее першая шлюзавая брама, хавае рукі ў кішэні.

А вось другі выпадак. У лагеры быў адзін мастак. Да лагера займаўся тым, што краў з музеяў рэдкія экземпляры каштоўнейшых карцін, замалёўваў іх такім-сякім пейзажам, каб не заўважылі і прадаваў карціны ў замежныя дзяржавы. За гэта і папаў у лагер. «А ў лагеры, — піша пра мастака адзін з журналістаў, — надумаўся мастак на волю бегчы. Дастаў «ліпу», падбіў хлопцаў, выбраў тэрмін. Але калі прыйшоў тэрмін, мастак маляваў для клуба дэкарацыі да пастаноўкі «Яўгені Анегін». Сабраў ён падарожнікаў сваіх і просіць, каб пачакалі, пакуль другі акт дамалюе. Захапіўся, маляваў. А як дамаляваў другі акт, тады зусім запікаўся, захацелася паглядзець і «самую пастаноўку. Сябры ўцякалі, а мастак так і застаўся, а пазней яго вызвалілі».

* * *

Гор

ПАДРЫХТАВАЦЬ ДА ЗІМЫ ВАДАСНАБЖЭННЕ НА ЧЫГУНЦЫ

Вадаснабжэнне ў сістэме чыгуначнай гаспадаркі адыгрывае далёка не апошнюю ролю. Леташняй зімой, з прычыны дрэннай падрыхтоўкі вадакачак, ваданапорных веж, вадаразборных і гідракалонак буйнейшыя станцыі засталіся без вады, зрывалася свячасовае адпраўленне соцень паязнёў.

Матэрыялы, якія сёння друкуюцца, сведчаць, што ўрокі гэтыя не ўлічаны. На буйнейшых вузлах БССР—Віцебскім і Аршанскім—да гэтага часу фактычна не разгарнулася падрыхтоўка вадаснабжэння да зімы, між тым усе гэтыя работы павінны былі быць ужо закончаны.

Сыгналы вельмі сур'ёзныя. Палітаддзелы, возьмеце пад свой большэвіцкі кантроль і гэты ўчастак падрыхтоўкі да зімы.

У запале ведамственных спрэчак

ОРША. (Ад нашага спецкора).

Аршанскае дэпо не раз прыводзіла ся ў «Звязде», як узорнае. І не без падставы. Дэпо сапраўды мае рад значных поспехаў, заваяваных пад кіраўніцтвам партыйнага калектыва. Тым больш недагушчальны асобныя прарывы ў яго рабоце.

Зараз мы хочам расказаць, як аршанскае дэпо безадказна аднеслася да важнейшай работы па падрыхтоўцы вадаснабжэння да зімы. Гэта-ж факт, што дэпо (начальнік **Барысаў**) фактычна ўхілілася ад усёй работы, звязанай з уцяпленнем вадакачак, вадапамповых вежаў, вадаразборных і гідракалон, пажарных і іншых студняў і г. д.

Начальнік дэпо Барысаў проста заявіў: «Нас гэта зараз не датычыць, уцяпленне перайшло да дыстанцыі шляху.

Апошняе безумоўна правільна. Работы па ўцяпленні сапраўды ўскладзены на службу шляху, аднак гэта зусім не азначае, што з дэпо знімаецца адказнасць за свячасовую і высокаякасную падрыхтоўку вадаснабжэння да зімы. Дэпо не можа застацца ў ролі пасіўнага назіральніка. Яно абавязана забяспечыць непасрэдны кантроль і праверку таго, як служба шляху выконвае работы па ўцяпленні, рамонту і г. д. Гэтага дэпо не робіць.

Замест работы, паміж **Барысавым** і начальнікам дыстанцыі шляху **Касарэвічам** ішлі ведамственныя спрэчкі, хто, нарэшце, павінен практычна займацца ўцяпленнем. У выніку да апошніх дзён гэтым ніхто не займаўся. Толькі зараз дыстанцыя шляху даволі нерашуча бярэцца за работу. Аднак, плана да гэтага часу няма, няма і патрэбных матэрыялаў.

Намеснік начальніка дыстанцыі шляху тав. **Сільноў** нават абразіўся, калі да яго звярнуліся з запытаннем, як ідуць работы па ўцяпленні.

Як сапраўды па такім дробязным пытанні трывожыць «начальства»? Для гэтага выгучан технік **Прохараў**, у яго і пытайцеся. Технік вылучаны, але чым ён займаецца і пасіўнен займацца — не ведае і сам Сільноў. Нічога яснага на гэта пытанне тых мог адказаць і тэхнік Прохараў. На практычны—вадаснабжэнне, адказнейшая справа, адзін з важнейшых элементаў падрыхтоўкі чыгуначнага транспарта да зімы — перадаецца малаадказнаму чалавеку, ды яшчэ з цёмным мінулым—Прохараву.

Кіраўніцтва дыстанцыі шляху—стаіць у баку, не кіруе гэтай справай. Прохораў спасылаецца, што патрэбныя колькасць матэрыялы для ўцяплення ў яго ёсць, аднак ён аказаўся ў вельмі цяжкім палажэнні, калі мы папрасілі назваць лічбы патрэбнага матэрыяла. Ён гэтага не ведае. Больш та го, ён яшчэ да гэтага часу не зрабіў заяўкі матэрыяльна-гаспадарчай часткі на патрэбны матэрыял.

Які-ж сапраўдны стан вадаснабжэння на сённяшні дзень? Выключна дрэнны. На многіх станцыях палаваны зрубы. Няма падвойных крышак. Да ўцяплення яшчэ не прыступілі. На станцыі Орша-Уходняя калектары па адыходу вады не працуюць. Станцыя літаральна топне ў гразі. Усе качагарныя ямы каля гідракалонак і кагтлы-ашчыкі студні пераапоўнены вадой. Іх не толькі нельга ў такім стане ўцяплянць, але ў выпадку пажарнага нават рамантаваць. З мінулага года пазбаўзбураны фундаманты гідракалонак не адрамантаваны.

Не ўцеплены вадакачкі. Дах вадакачкі станцыі Орша-цэнтральная цячэ, шыбы выбіты. Не ізаляван паравод. Вадакачка не забяспечана ні адным кілаграмам вугалю. Заяўка на вугаль была дана начальніку гаспадарчага ўчастка **Грамакову** яшчэ 4 кастрычніка, але ён і не думае яе задаволіць. Не лепш становішча і на ваданапорнай вежы.

Заслугоўвае выключнай увагі тое, што на станцыі Орша-заходняя з мінулага года не працуе пабудаваная новая прыёмная студня з фільтрам. Дыстанцыя шляху не забяспечыла пракладкі труб ад студні да вадакачкі і не ўстанавіла прыёмнага клапана. Гэта ў той час, калі старая студня забруджана, ёсць простая пагроза астанаўкі вадакачкі.

Ці можна пасля ўсіх гэтых фактаў гаварыць аб сур'ёзнай падрыхтоўцы да зімы аршанскім дэпо і дыстанцыі шляху? Ні ў якай меры. Заняўшыся ведамственнымі габлетнымі спрэчкамі, кіраўнікі дэпо і службы шляху правялі падрыхтоўку да зімы важнейшага ўчастка чыгуначнага транспарта—вадазабеспячэнне. Адказнасць за гэта цалкам кладзецца на іх.

Р. Додзін.

Узор злачыннай безадказнасці

ВІЦЕБСК. (Наш спец. кар.).

Начальнік Віцебскага дэпо **Ефімаў** не без іронніі сустрэў нашу пытанне аб хаце падрыхтоўкі да зімы на лініі вадазабеспячэння:

— Вось вазнасць, я павінен клапаціцца аб бозьці сур'ёзным...

Ефімаў сапраўды не толькі не клапоціцца, але і пастул не цікавіцца пытаннем вадаснабжэння. Ён лічыць гэта дробяззю. Невыпадкова-ж ён не ведаў да нашай гутаркі, што работу, прадпісаную па ўцяпленні пазвіна пра экзэкуціць служба шляху. Можна было падумаць, што ў сувязі з гэтым дэпо само праводзіць уцяпленне. Нічога падобнага.

Дыстанцыя-ж шляху (начальнік **Рыпінскі**) правальвае работу па ўцяпленні вадаёмных будынкаў, калонак, ступняў, і інш. Між тым па такім буйнейшым вузле, як Віцебскі, дзе штодзённа праходзяць сотні цягнікоў, пытанне аб бесперапынным забеспячэнні іх вадой у зімовы перыяд набывае выключна важнае значэнне.

Як-жа ідуць падрыхтоўчыя работы ў гэтым напрамку? Дамо слова фактам. Ваданапорная лінія адной вадакачкі калідоджана па 300 метраў. Рамонт быў прадугледжан яшчэ ў III квартале, але і да гэтага часу да яго яшчэ не прыступлена. Ці прыняла дыстанцыя шляху і дэпо сур'ёзныя меры да таго, каб свячасова выканаць рамонт? Не, не прынялі.

На працягу лета было 7 прарываў вадаправодных ліній, тры з іх да гэтага часу не ліквідаваны. Да работ па ўцяпленні яшчэ не прыступлена. Няма і матэрыялаў. Да гэтага часу не дагаварыліся, хто павінен уцяплянць гідракалонкі. Начальнік дэпо **Ефімаў** быў упэўнен, што гэту работу правядзіць дыстанцыя шляху, а начальнік дыстанцыі **Рыпінскі** спасылаецца на нейкую тэлеграму дырэкцыі дарогі, якую, да рэчы, ніяк не ўдалося знайсці, паводле якой уцяпленне гідракалонак павінна праводзіць само дэпо.

На галоўнай Дзвінскай вадакачцы цячэ дах, паламана падлога, столь патрабуе падшыўкі. На другой вадакачцы з трох рухавікоў працуе толькі адзін, рэшта чакалькі дзён як стаялі на рамонт і калі рамонт закончыцца, ніхто не ведае, гэта планам не прадугледжана. Не працуе адна цэнтрабежная помпа. На ўсю вадакачку—адна печка. Труба ўстанавіць другую, але ніхто гэтым пытаннем не займаецца.

Дзесяткі пажарных і іншых студняў без даха, запоўнены вадой. Няма стокаў. Дзве гідракалонкі, што каля дэпо, не маюць сточных студняў. Гэта азначае, што зімой тут будзе бязупынна нарастаць лёд, і магчымы сходы паравозаў з рэек.

Такім чынам, работы па захаванні вадаснабжэння ад марозаў на віцебскім вузле да сутнасці яшчэ не пачаліся. Тут прапаўляецца адкрыты сабатаж пастановы партыі і ўрада аб большэвіцкай сустрэчы зімы.

Пролетарскі.

БССР напярэдадні 16-й гадавіны Кастрычніка

ГОНАР СОВЕЦКАЙ АРХІТЭКТУРЫ

З Дома ўрада зняты апошнія рыштаванні

Шырока раскінуўся корпус Дома ўрада. Ідуць апошнія падрыхтаванні да здачы яго ў эксплаатацыю. Работа вядзецца круглыя суткі, падцягваюцца адстаючыя ўчасткі, ліквідуюцца недаробкі.

Завяршэнне Дома ўрада ў Менску — буйная перамога працоўных БССР. Дом урада па свайму маштабу буйнейшая ў саюзе пабудова грамадзянскага тыпа. Гэта цэлы горад жалеза і бетона. Сілуэт яго выдзяляецца над усім горадам, ён відзён за дзесяткі кілометраў.

13 млн. цаглін.

Дзесяткі тысяч бочак цэменту.

220 тысяч кубічных метраў агульнай кубатуры.

40 тысяч квадратных метраў карысной плошчы.

600 паколў.

12 ліфтаў.

Гэтыя лічбы даволі красамоўна гавораць аб грандыёзнасці Дома ўрада, які будавала ўся рэспубліка.

Аналагічны будынак ёсць у сталіцы УССР у Харкаве. Гэта вядомы Дом прамысловасці.

Асаблівасці будаўніцтва Дома ўрада — каменны і жалезабетонны каркас сцен і перакрыццяў, што надае яму выключную моцнасць і супрацьпажарную бяспечнасць.

У Доме ёсць рад залаў. Найбольшы інтарэс прадстаўляюць цэнтральная зала з'ездаў на тысячу месц, размешчаная амфітэатрам, зала ЦВК і зала СНК. Апошнія дзве залы аддзеланы штучным мрэмарам і дубам. Залы з'ездаў абсталяваны спецыяльнымі крэслами новай дасціпнай канструкцыі. Яна радыёфікуецца па ўзоры залы Камінтэрна. У ёй-жа ўстанаўляюцца дзяржаўныя гербы ўсіх саюзных рэспублік. Гербы зроблены з рускіх самацветаў у вядомых майстэрнях Ленінградскай Акадэміі Мастацтваў.

Не меншую цікавасць прадстаўляе ўнутранае мастацкае афармленне Дома ўрада. Над гэтай работай заняты дзесяткі лепшых мастакоў і скульптараў Саюза і БССР.

У цэнтральных мясцах — у кулуарах, у запах пасяджэнняў размяшчаюцца партэты правадыроў і вялікая панарама узяцця Зімняга палаца, момант прыезда ЛЕНІНА ў Расію, СТАЛІН на фоне сацыялістычнага будаўніцтва, работы заслужанага дзеяча мастацтва БРОДСКАГА і вядомага ленінградскага мастака ФРЭНЦА.

На галоўных лесвіцах, вядучых у ЦВК і СНК, у залу з'ездаў на п'едасталах скульптурныя бюсты КАРЛА МАРКСА, ЭНГЕЛЬСА, БАБЕФА, ЧЭРНЫШЭЎСКАГА, ЛІБКНЕХТА, МЯСНІКОВА, ДЗЕРЖЫНСКАГА і ФРУНЗЕ, зробленыя брыгадай скульптараў БССР пад кіраўніцтвам тав. КЕРЗАНА. Выдзяляюцца работы маладых беларускіх скульптараў АЗГУРА і БЕМБЕЛЯ.

З пабудоваў Дома ўрада вызваляюцца дзесяткі жылых дамоў, ліквідуецца раскіданасць наркаматаў па ўсяму гораду, рацыяналізуецца работа совецкага апарата. Раённыя работнікі, калгаснікі, прыяжджаючыя ў Менск, змогуць у най карацейшы тэрмін вырашаць свае справы і тут-жа ў касе гарадской станцыі, якая размешчана ў Доме ўрада, атрымаць білет на праезд назад.

***

Аўтар праекта — ЛАНГБАРД І. Г. — адзін з буйнейшых майстроў совецкай архітэктуры. Ён вядомы Совецкаму саюзу як аўтар раду важных праектаў і ўдзельнік шматлікіх конкурсаў.

Па запрашэнні спецыяльнай камісіі, прыяжджаўшай са Сталінграда ў Менск для азнаямлення з будаўніцтвам Дома ўрада, тав. ЛАНГБАРД склаў праект дварца Совецкага Ніжня-Волжскага края ў Сталінградзе.

М. КІН.

7 лістапада ўрачыстае адкрыццё Дома ўрада і помніка В. І. Леніну

Прэміяванне ўдарнікаў будаўніцтва

Дом урада і **помнік В. І. Леніну** ў Менску адкрываецца 7 лістапада ў 4 гадзіны дня.

Для правядзення падрыхтоўчай работы Саўнарком БССР выпусціў урадавую камісію ў складзе т. т. **Балціна** (старшыня); **Хацкевіча, Пыжыкава, Карзнеўскага, Гурэвіча Н., Васермана і Глейбермана.**

Адкрыццё Дома ўрада і помніка В. І. Леніну адбудзецца пры ўдзеле дэлегацый менскіх фабрык і заводаў, усебеларуская злёта калгаснікаў-ударнікаў і ўсіх працоўных.

Запрошаны таксама прадстаўнікі ад усіх Саюзных рэспублік, а таксама **Масквы, Ленінграда і Заходняй вобласці.**

Пляшу, што каля Дома ўрада, пашэцца імя **Леніна.**

У сувязі са скачэннем будаўніцтва Дома ўрада Саўнарком пастанавіў выдаць спецыяльным урадавым граматы і прэміі кіраўнікам будаўніцтва і лепшым ударнікам-рабочым і спецыялістам.

Пры аслабанні будынкаў пасля пераезду наркаматаў у Дом урада, некаторыя колькасць кватэр будзе размеркавана сярод лепшых ударнікаў, працуючых па будаўніцтве Дома ўрада.

Уночы з 5 на 6 лістапада роўна ў 12 гадзін ночы праводзіцца **УСЕБЕЛАРУСКАЯ РАДЫЁНАРАДА** па пытанню аб правядзенні святкавання XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі з дакладамі з месц.

На нараду выклікаюцца раённыя і гарадскія камісіі па падрыхтоўцы да свята, сакратары РК КП(б)Б, старшыні РВК і гарсоветаў і начпалітаддзелаў.

Нараду праводзіць сакратар ЦК КП(б)Б т. ШАРАНГОВІЧ.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЎРАДАВАЯ КАМІСІЯ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ І ПРАВЯДЗЕННІ XVI ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ.

У Менск прыяжджае група германскіх палітэмігрантаў

ПА ЗАПРАШЭННЮ ЦК МОПР'а БССР ДЛЯ ЎДЗЕЛА Ў КАСТРЫЧНІЦКІХ СВЯТАХ У МЕНСК З МАСКВЫ ПРЫЯЖДЖАЕ ГРУПА ГЕРМАНСКІХ ПАЛІТЭМІГРАНТАЎ. ЗА ЧАС ПРАБЫВАННЯ Ў БССР ПАЛІТЭМІГРАНТЫ НАВЕДАЮЦЬ РАД ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ г. МЕНСКА І ІНШЫХ ПРОЛЕТАРСКІХ ЦЭНТРАЎ РЭСПУБЛІКІ, І ВЫСТУПАЮЦЬ З ДАКЛАДАМІ АБ СТАНОВІШЧЫ І ЖЫЦЦІ РАБОЧЫХ У КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІНАХ І ЗАДАЧАХ МОПР'а.

(БЕЛТА).

Новыя клубы, школы і больніцы

Да 7 лістапада прыстасоўваецца адкрыццё НОВАГА РАБОЧАГА КЛУБА на 400 месц і СТАЛОВАЙ на 1.000 абедаў пры МЕНСКІМ ХЛЕБАКАМБІНАЦЕ. Заканчваецца таксама рамонт 7 механічных печаў.

ДЗВЕ НОВЫЯ ШКОЛЫ КАЛГАСНАЙ МОЛАДЗІ адкрываюцца ў калгасе «ЧЫРВОНЫ ПЕРАКОП», Палымінскага сельсавета, і калгасе «ЗАГАРАНЫ», Кузмінскага сельсавета, Герадоцкага раёна.

У Гаралку заканчваецца пабудова БОЛЬНІЦЫ на 55 ложкаў. (БЕЛТА).

Гандаль у кастрычніцкія дні

Наркамснаб БССР устанавіў па асноўных гарадах рэспублікі палупцы парадак гандля ў дні свята 16-й гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі.

Хлебныя крамы па нармаванаму снабжэнню 4, 5, 6, 7 і 8 лістапада працуюць у звычайным парадку.

Усе крамы Белгандля па свабоднаму продажу хлеба 4 і 5 працуюць у звычайным парадку, а 6 лістапада — да 12 гадзін ночы; 7-га лістапада крамы закрыты; 8-га — крамы працуюць у звычайным парадку.

Размеркавальнікі №№ 4, 5, 6 працуюць да 12 гадзін ночы; 7-га і 8 лістапада размеркавальнікі будуць закрыты.

Прамтаварныя адкрытая гандлёвая сетка 4-га, 5-га і 6-га падаўжаюць час прады на 2 гадзіны, а 7 лістапада ўсе прамтаварныя магазіны закрыты; 8 лістапада працуюць дзяжурныя магазіны з 11-ці гадзін да 17-ці.

Кіёскі, ларкі і крамы па гандлю фруктовымі водамі і півам 6, 7 і 8 лістапада працуюць у звычайным парадку.

У кожным горадзе 7 і 8 лістапада павінна працаваць выстарчальная сетка дзяжурных бакалейных магазінаў.

Адкрытыя сталовыя, буфеты і рэстараны 6, 7 і 8 лістапада працуюць у звычайным парадку.

Парадак работы сталовых пры прадпрыемствах устанаўляецца на месцах.

ПАБУДУЕМ ЭСКАДРЫЛЬЮ імя т. Кагановіча

На бягучым рахунку 1.123.781 рубель

За ўчарашні дзень у фонд пабудовы эскадрыльі імя тав. Кагановіча паступіла 2.830 рублёў: ад арганізацый прадпрыемстваў і ўстаноў г. Менска—756 руб.; з раёнаў: **Дрысенскага**—304 р., **Чэрвеньскага**—298, **Драпойскага**—408, **Полацкага**—603, **Сіроцінскага**—166 і **Церахаўскага** — 291 руб. Усяго на бягучым рахунку **1.123.781 руб.**

Уносяць і выклікаюць

Клубы, бярыце прыклад з „Чырвонага будаўніка"

* Праўленне клуба «Чырвоны будаўнік» наладзіла вечар самадзейных гурткоў клуба і выручку ў суме 640 руб. унесла ў фонд пабудовы авіяэскадрыльі імя т. Кагановіча. Праўленне клуба выклікала пастаўць іх прыкладу ўсе клубы г. Менска.

ІВКІН.

* Настаўнікі і вучні ўчанскай ШКМ (Бярэзінскі раён) сабралі 85 руб. у фонд авіяэскадрыльі і выклікаюць дзмітраўскую, в.-лагаўскую і дуленскую ШКМ.

АРЦЮКОЎСКІ.

* На выклік т. **ЧЫКУНОВА** ўнесці 20 руб. і выклікаю **Партнова** (расонскі РВК); **Соскіна** (аршанскі РК КП(б)Б); **Шнытко** (Капыльская МТС) і **Майсеева** (саўгас Рыме).

ШПАК.

* На выклік т. **ПІНКІСА** ўнесці 10 руб. і выклікаю т. т. **Кумпеля, Папова, Зелюткіна, Каца і Чарткова** (ІНУ НКЮ); **Кузняцова, Сакольчыка** і **Сцяпанава** (Белторф).

ТУРЧЫН.

Паведамленне

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 4-га лістапада т. т. у тор. Менску (Совецкая, 55, ЦКК) будзе засядаць рэспубліканская камісія па чыстцы па разгляду апеляцый на рашэнні менскай гарадской наступных таварышоў:

Коняка А. Д., Кучука М. Н., Сібіральскага Э. І., Бляхера М. К., Сосліна І. І., Гельфанда Х. І., Сідэра І. І., Гельфанда А. А., Маскалёва П. І., Штэймана І. М., Бурднера С І., Саламонава Н. Э., Дзятлоўскай А. П., Энтельсона Я. Е., Жытніксіча А. К., Вайнберга Б. В., Шырко М. А., Васілеўскага В. М., Сцепанюка А. Е., Кавалёнка К. І., Цукера М. А., Гутман Б. І., Цырыліна С. М., Ручана Г. І., Дуленца Я. Р., Тукоця П. В., Ледвіча С. М.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ПАСТАНОВА

Менскага Гарадскога Совета Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

3 лістапада 1933 г. г. Менск

Аб святкаванні XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі

У сувязі з правядзеннем святкавання XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі Менскі Гарадскі Совет **ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

1. Абавязаць кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў, прамадскіх і прафесіянальных арганізацый, ЖАКТы, жытгрэст і прыватных дамаўладальнікаў да 6 лістапада 1933 г. да 16 гадзін упрыгожыць займаемыя імі дамаўладанні сцягамі, лозунгамі, плакатамі і ілюмінаваць іх.

2. Пад адказнасць праўленняў жактаў, загадчыкаў дамамі, кіраўнікоў грамадскіх, прафесіянальных арганізацый і ўстаноў 5 лістапада да 16 гадзін скончыць поўную ачыстку дамаўладанняў, двароў, вуліц і трагуараў.

3. Абавязаць загадчыкаў магазінаў і дырэктараў прадпрыемстваў, якім прадстаўлены вітрыны для выставак, скончыць упрыгожванне апошніх 5-та лістапада да 19 гадзін.

4. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на РС міліцыю.

Старшыня Менскага Гарадскога Совета КАРАНЕЎСКІ.
Сакратар Менгарсовета КАПЕЛЕВІЧ.

ПАСТАНОВА

Аддзела снабжэння менскага гарадскога совета

2 лістапада 1933 г. г. Менск

Аб парадку вытварэння гандля ў святочныя дні 16-й гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі

Аддзел снабжэння менгарсовета ПА СТАНАЎЛЯЕ:

1. Гандаль у святочныя дні вытвараецца наступным парадкам:

а) 3-га, 4-га, 5-га і 6-га ЛІСТАПАДА ўсе прадуктовыя магазіны, хлебныя крамы, ларкі і кіёскі ПРАЦУЮЦЬ ДА 12-ЦІГАДЗІН НОЧЫ;

б) 3-га, 4-га, 5-га і 6-га ЛІСТАПАДА рынкі працуюць на дзве гадзіны пазней звычайнага парадку. 7-ГА ЛІСТАПАДА ГАНДАЛЬ НА РЫНКАХ НЕ ВЫТВАРАЕЦЦА;

в) 7-га ЛІСТАПАДА хлебныя крамы МГРК гандлююць З 2-Х ГАДЗІН ДНЯ ДА 11-ЦІГАДЗІН НОЧЫ;

г) сталовыя і рэстараны працуюць 6-га, 7-га і 8-га лістапада ў звычайным парадку.

Гарснаб ЭЛЬПЕРЫН.

РАСКЛАД

КОНСУЛЬТАЦЫІ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ ШКМ, ПАЧАТКОВЫХ ШКОЛ, ШКОЛ II КАНЦЭНТРА, МАЛАПІСЬМЕННЫХ І РАБОТНІКАЎ ДАШКОЛЬНЫХ УСТАНОЎ МЕНСКАГА РАЁНА.

Па якому прадмету	Гадзіны кансульт.	Чыслы, месяцы, у якія адбываюцца кансультацыі
ПА II КАНЦЭНТРУ		
Грамадазнаўства і гісторыя	3—5	12-XI, 26-XI, 10-XII, ~~24-XII~~
Матэматыка	2—4	19-XI, 26-XII, 24-XII
Фізіка	2—4	19-XI, 3-XII.
Хімія	2—4	12-XI, 26-XI, 10-XII, 24-XII
Прыродазнаўства	2—4	19-XI, 3-XII, 24-XII.
Геаграфія	2—4	12-XI, 12-XI, 17-XII, 24-XII
Бел. мова і літаратура	1—2	12-XI, 24-XII.
Сельская гаспадарка	2—4	19-XI, 3-XII.
Руская мова і літаратура	2—4	12-XI, 24-XII.
Нямецкая мова	2—4	12-XI, 24-XII
Працоўнае навучанне	2—4	12-XI, 26-XI, 24-XII.
Пазашкольная мас. раб.	2—4	19-XI, 10-XII.
	2—4	12-XI, 24-XII.
Піянерработа	2—4	12-XI, 24-XII.
Ізо і чарчэнне	2—4	12-XI, 10-XII.
ПА I КАНЦЭНТРУ		
О-х групах	2—4	12-XI, 24-XII
Грамадазнаўства	2—4	19-XI, 26-XII, 10-XII, 24-XII
Арыфметыка	2—4	12-XI, 19-XI, 24-XII
Прыродазн. і гісторыя	2—4	12-XI, 24-XII
Беларуская мова	2—4	12-XI, 17-XII.
Ягурэйская мова	2—4	19-XI, 17-XII.
Польская мова	2—4	12-XI, 24-XII.
Руская мова	2—4	5-XI, 19-XI, 3-XII, 17-XII
Працоўнае навучанне	2—4	26-XI 24-XII.
Пазашкольн. мас. раб.	2—4	19-XI, 10-XII
	2—4	12-XI, 24-XII.
Піянерработа	2—4	12-XI, 24-XII
Музо	2—4	12-XI, 24-XII.
ПА ДАШКОЛЬНЫХ УСТАНОВАХ		
Па дашкольнай рабоце	12—3	5-XI, 12-XI, 19-XI, 26-XI 10-XII, 3-XII, 17-XII 24-XII
ПА БІБЛІЯТЭЧНАЙ РАБОЦЕ.		
Па бібліятэчнай рабоце	2—4	12-XI, 26-XI, 10-XII, 24-XII.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
(вул. Валадарскага, 7, т.л. № 21-813)
Адкрыццё сезона 12, 13, 15, 16, 17, 18 лістапада
РЭКРУТ
Пастаноўка заслуж. артыста рэспублікі М. Ф. РАФАЛЬСКАГА.
Пачатак у 8 гадз. вечара.
Білеты ў касе тэатра і ў рабоч. касе.
Прымаюцца заяўкі на культпаходы і метавыя спектаклі.

Чырвоная Зорка — Гукавы фільм Аненкоўшчына
Кіно Інтэрнацыянал — ПРЫГОДЫ ПАДКІДЫША 1-я СЕРЫЯ
СПАРТАК Каса—з 4-х г. дня. — Замежны мастацкі фільм ДРУГІ ШЛЮБ драма ў 8 частках

МЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ КАМІСІЯ
паведамляе, што 5 лістапада у 6 гадз. веч. у клубе Эльвода (Совецкая вул.)
АДБУДЗЕЦЦА
ЗЛЁТ ЧЫРВОНАГВАРДЗЕЙЦАЎ І ЧЫРВОНЫХ ПАРТЫЗАН,
прысвечаны XVI ГАДАВІНЕ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ.
Пасля афіцыяльнай часткі—КАНЦЭРТ.
Старшыня партызанскай камісіі Залескі

ЛАЗНЕ-ПРАЛЬНАЕ КІРАЎНІЦТВА
паведамляе, што
для лепшага абслугоўвання рабочых г. Менска
Усе лазні 4, 5 і 6 лістапада будуць працаваць з 7 гадз. раніцы да 12 гадзін ночы

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТРЭСТ СКУРАБУТКОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ
„БЕЛКОЖОБУТТРЕСТ"
АБ'ЯДНАЕ: 5 скуразаводаў, 3 абутковыя фабрыкі, рымарную і галантарэйную фабрыку і 2 школы ФЗВ.
Дзяржаўны капітал на 1-1-33 г.— млн. руб. 15,4.
Выпуск прадукцыі за 1933 г. (чакаемае выкананне плана)
а) у натуральным выражэнні
абутак тысяч пар . . . 2700
хромав. тавар тыс. кв. мэтр . 1000
настоўе . . . 319
палувал тон . . . 1353
сыраманяць . . . 451
вячын. тысяч штук . . . 278
б) у грашовым выражэнні млн р. 48,3
спісачны лік рабочых 4600 чал.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР
Ад 4 лістапада
Гукавы мастацкі фільм драма ў 8 частках.
ЗДАНЬ, ЯКАЯ НЕ РАРОЧВАЕЦЦА
Усе ролі: О. Жызнёва, В. Фэрдынандаў і М. Штраух
У праграме—гукавая хроніка. Пачатак сеансаў: 11 гадз., 3, 5, 7, 9 гадз.

Кіно „ПРОЛЕТАРЫЙ"
Сёння, 4 лістапада, мастацкі совецкі фільм
ТЫЯ, ЯКІЯ СТАЛІ ВІДУШЧЫМІ
кіно-эпапея ў 6-ці частках
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:
рускі салдат — І. Клюквін,
замежны салдат—Л. Беотаў,
замежны афіцэр—Д. Поярыцын.
Пачатак 1-га сеанса ў 6 гадз. веч.
КАСА—з 4 гадз.

ТАРГСІН
(Беларуская кантора)
заводзіць да ведама насельніцтва, што да надыходзячых кастрычніцкіх свят і асенне-зімовага сезона прыбыў
ВЯЛІКІ ВЫБАР НАСТ. ТАВАРАЎ:
1. Імпартны трыкатаж.
2. Розная мануфактура: фланель, бумазея, байка і інш.
3. Валяны і прыгожы абутак, боты фетравыя, валёнкі, туфлі, бацінкі, галошы, боцікі гумовыя.
4. Поўны асартымент розных футровых тавараў.
5. Апошнія фасоны і поўны выбар гатовай адзежы.
6. Імпартныя шэрсцяныя і ватнія коўдры.
Таксама ёсць у продажы па новых паніжаных цэнах алюмініевая і эмаліраваная пасуда, навейшыя пласцінкі чыстай музыкі „Джаз-Банд", апал, керасін, прадметы оптыкі.
Розныя імпартныя медыкаменты.
ТОРГСІН.

Гіпрадору пры Галоўдартрансе патрэбны глебаведы і геолагі
для работы па глебавым і геалагічным вышуках. Аплата згодна існуючых ставак.
З прапановамі звяртацца: Менск, Савецкая, № 8, 3-ці паверх.

Дрыбінскаму тэхнікуму свінагадоўлі
ПАТРЭБЕН выкладчык па арганізацыі і механізацыі жывёлагадоўчай сельскай гаспадаркі.
Заявы накіроўваць па адрасу: Пашт. адз. Дрыбін, Горацкага раёна. Чыг ст. Цёмны лес. Дрыбінскаму тэхнікуму свінагадоўлі.

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б— *ПАРТВЫДАТ*

ЛІТАРАТУРА ДА XVI ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

ЛЕНІН. — Прамовы ў гадавіну Кастрычніка.

ЛЕНІН. — Ці ўтрымаюць большэвікі дзяржаўную ўладу.

ЛЕНІН. — Задачы пролетарыята ў нашай рэволюцыі.

ЛЕНІН. — Аграрная праграма рускай сацыял-дэмакратыі.

ЛЕНІН. — Поспехі і труднасці совецкай улады.

СТАЛІН. — Аб Кастрычніцкай рэволюцыі.

Сталін. — Аб чарговых задачах партыі ў нацыянальным пытанні (на беларускай і ягурэйскай мовах).

СТАЛІН. — Пытанні ленінізма (дадатні).

СТАЛІН. — Аб асновах ленінізма.

СТАЛІН. — Аб некаторых пытаннях гісторыі большэвізма.—Трыццаць год большэвіцкай партыі (1903-1933).

ПОСТЫШАЎ. — Да новых перамог у барацьбе за асваенне.

ЛЫЧОЎ і ЛЮБІМАЎ. — Вывесці прамысловасць БССР на перадавыя лініі (на беларускай і ягурэйскай мовах).

Пералічаныя кнігі патрабуйце ва ўсіх філіялах і кнігарнях Дзяржвыдбела, райсаюзаў і БАКТ'а.

Пры адсутнасці пералічаных назваў на месцах, шліце заказы па адрасу:

МЕНСК, К. МАРКСА, 14, ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б—ПАРТВЫДАТ.

ПАСТАНОВА № 29

ПРЭЗІДЫУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

2 лістапада 1933 г. г. Менск

Аб рамонце турбіны „Метра-Вікерс" і нацельнай электрастанцыі, у сувязі з уступленнем у зімовы максімум

1) Лічыць неабходным вытварыць рамонт турбіны „Метра-Вікерс" і нацельных установак электрастанцыі на працягу 7, 8 і 9 лістапада, для чаго дазволіць дырэкцыі спыніць падачу электраэнергіі прадпрыемствам горада 9 лістапада.

2) Электрастанцыі аб гэтым давесці да ведама ўсіх прадпрыемстваў горада.

СТАРШЫНЯ МЕНГАРСОВЕТА КАРАНЕЎСКІ
САКРАТАР МЕНГАРСОВЕТА КАПЕЛЕВІЧ

БЕЛГАНДАЛЬ

Дынаміка разгортвання гандлёвай сеткі

ПЕРЫЯДЫ	ГОРАД			СЯЛО			РАЗАМ		
	Магаз.	Ларк	Разам	Магаз.	Ларкі	Разам	Магаз.	Лар.	Разам
Было на I|IV-31 г.	1	—	1	—	—	—	1	—	1
„ „ I|I -32 г.	59	9	68	14	—	14	73	9	82
„ „ I|I -33 г.	123	47	170	173	25	198	296	72	368
„ „ I|X -33 г.	219	54	273	181	27	208	400	81	481

Дынаміка тавараабарота па Белгандалю ў тыс. руб.

ПЕРЫЯДЫ	АГУЛЬНЫ АБАРОТ			Сярэд. месячны абарот		
	Горад	Сяло	Разам	Горад	Сяло	Разам
З I|IV-да 31|XII-31 г.	20549	246	20795	2283	27	2310
За 1932 г.	62805	18292	81097	5234	1524	6758
З I|I-да I|IX-33 г.	79656	15877	95533	8851	1764	10615
Абарот 1933 г. у проц. да